Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 46 (3950)
АЎТОРАК, 17 ЛЮТАГА 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫНКА

Да вынікаў другога пленуму менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б

Пазаўчора скончыў свае работы 2-гі пленум менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б.

Паўтара месяца, што прайшлі з моманту зьліцьця Фрунзаўскай і Кастрычніцкай партарганізацый у адну—менскую гарадзкую, з усёй паўнатой паказалі правільнасьць гэтага арганізацыйнага мерапрыемства, выкліканага задачай «забесьпячэньня лепшага партыйнага кіраўніцтва: а) мабілізацыяй мас вакол пытаньняў разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва; б) гаспадарчым, камунальным, культурным будаўніцтвам, квапэрацыяй, большым прыцягненьнем гарадзкой партарганізацыі да гэтага будаўніцтва» (з пост. ЦК КП(б)Б аб аб'ідн. Фрунз. і Кастрычн. партарганізацый).

Менская гарадзкая партарганізацыя—перадавы атрад КП(б)Б—за час свайго існаваньня, пад бальшавіцкім кіраўніцтвам гаркому і ЦК КП(б)Б, яшчэ больш узмацніла сваю клясавую бязьдольнасьць, яшчэ цясьней згуртавала свае рады вакол генэральнай лініі партыі, дабілася новых посьпехаў у справе канкрэтызацыі партыйнага кіраўніцтва ўсімі галінамі сацыялістычнага будаўніцтва. Вось першы вывад, які трэба зрабіць па выніках пленуму гаркому.

Работы пленуму былі прысьвечаны вырашэньню бявых гаспадарча-палітычных задач, зьвязаных з бягучым этапам нашага разьвіцьця.

Тэрытарыяльнае аб'яднаньне Фрунзаўскага і Кастрычніцкага раёнаў высоўвае перад менскай гарадзкой арганізацыяй адназныя задачы па кіраўніцтве РАЗЬВІЦЬЦЁМ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ПРЫГАРАДНАГА РАЁНУ.

Прадпасылкі, створаныя леніскай лініяй партыі для бурнага росту калектывізацыі, для сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на новай больш высокай тэхнічнай базе, посьпехі, дасягнутыя партыяй у справе ажыцьцяўленьня лёзунгу ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі—усё гэта, бясспрэчна, павінна даць свае найбольш поўныя і адчувальныя рэзультаты іменна ў Менскім раёне, як буйнейшым прамысловым цэнтры, непасрэдна зьвязаным з рэспубліканскімі кіруючымі арганізацыямі. Пытаньні разьвіцьця сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі прыгараднага раёну, бальшавіцкая падрыхтоўка да веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі набываюць ва ўмовах Менску яшчэ большае значэньне і таму, што яны непарыўна зьвязаны з вырашэньнем праблемы рабочага забесьпячэньня, у прыватнасьці з забесьпячэньнем працоўных Менску гародніной і малочнымі прадуктамі.

Прыгарадны раён мае рад буйных посьпехаў у справе практычнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі. Бальшавіцкае кіраўніцтва калгасным рухам забясьпечыла такое становішча, што да сучаснага моманту ў сацыялістычным сэктары знаходзіцца 57 ПРОЦ. ПАСЕЎНАЙ ПЛОШЧЫ, З ІХ ПАД САЎГАСАМІ—19 ПРОЦ. І ПАД КАЛГАСАМІ—38 ПРОЦ. На аснове гэтых посьпехаў неабходна разьвіваць далейшае наступленьне і, ажыцьцяўляючы ленінскі прынцып добраахвотнасьці, узьнімаць усё вышэй і вышэй хвалю калгаснага прыпіву.

Другая бальшавіцкая вясна будзе мець выключна важнае значэньне для ўсяго калгаснага будаўніцтва. Яна павінна канчаткова замацаваць посьпехі пройдзенага этапу, павінна паставіць на шлях аграмаджанай гаспадаркі новыя пласты бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Вось чаму пленум гаркому пытаньні падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ў прыгарадным раёне і па гаспадарках МЦРК паставіў, як баявую, неадкладную задачу ўсёй менскай партарганізацыі.

Пленум прызнаў, што падрыхтоўка да веснавой сяўбы яшчэ, як наложыць, не разгарнулася, што сучаснае становішча «ні ў якім разе не забясьпечвае пасьпяховага выкананьня даных заданьняў».

У прынятай пленумам рэзалюцыі дана апэрацыйная праграма разгортваньня падрыхтоўкі да веснавой пасеўной кампаніі, дакладна акрэсьлены заданьні і тэрміны выкананьня ўсімі арганізацыямі, якія маюць адносіны да гэтай работы. Побач з мерапрыемствамі, якія павінны забясьпечыць рашучы пералом у галіне своечасовага давазьненьня плянаў пасеўнай кампаніі, дачы цьвёрдых заданьняў кулацкім гаспадаркам, пералому ў галіне стварэньня насенных страхавых і фуражных фондаў, ачыстцы насеньня, рамонту с.-г. інвэнтару, загатоўкі насеньня гародных культур і г. д.,—пленум асабліва падкрэсьліў важнейшае значэньне ажыцьцяўленьня пляну кантрактацыі, бальшавіцкага правядзеньня справаздачна - перавыбарчай кампаніі ў калгасах, паляпшэньня арганізацыі працы ў апошніх, далейшага разгортваньня масавай работы на вёсцы, рашучага паляпшэньня работы сярод батрацтва і беднаты, перабудовы сельсаветаў тварам да калгаснага руху.

Уся падрыхтоўка і правядзеньне веснавой с.-г. кампаніі павінны быць падпарадкаваны асноўнай задачы—арганізацыі новага калгаснага прыпіву. Пленум вызначыў у 1931 годзе ахапіць калектывізацыяй 70 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, прычым да вясны 1931 году—60 проц. «На выкананьне гэтай задачы павінна быць мабілізавана ўвага ўсёй партарганізацыі, саветаў, каапэрацыі і ўсёй савецкай грамадзкасьці».

Веснавая с.-г. кампанія будзе адбывацца ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы, упартага супраціўленьня кулацтва і яго агентаў—апартуністаў. Барацьба за выразнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі складае асноўную ўмову пасьпяховага правядзеньня бальшавіцкай слябы, выкананьня пастаўленых пленумам задач.

Другім пунктам парадку дня пленуму стояла пытаньне аб падрыхтоўцы да БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ. Ня гледзячы на вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне гэтай справы ва ўмовах Менску, на даным вучастку становішча найбольш пагражаючае, і пленум быў прымушан канстатаваць, што падрыхтоўка ідзе да гэтага часу «зусім нездавальняюча і пагражае зрывам па цэлым радзе аб'ектаў».

Ніводнае падобнага становішча трэба шукаць у апартуністычнай недаацэнцы палітычнага значэньня будаўніцтва, што праяўляецца з боку цэпага раду будуючых і будаўнічых арганізацый, у наяўнасьці ў іх рабоце бязьдзейнасьці і самацёку.

Пленум абавязаў партчастку будаўнічых і будуючых арганізацый падрыхтоўку да будаўніцтва неадкладна разгарнуць па ўсім фронце, вызначаўшы каляндарныя тэрміны выкананьня важнейшых заданьняў. Сканчэньне праектаў і чарцяжоў, адвод вучасткаў, падрыхтоўка і падвоз будаўнічых матар'ялаў, забесьпячэньне пабудоў рабочай сілай, мэханізацыя будаўнічых працэсаў, павышэньне тэхнічнага кіраўніцтва, агульнае паляпшэньне якасьці працы, зьніжэньне будаўнічага індэксу, забесьпячэньне пабудоў прадуктамі і прамтаварамі, рашучае паляпшэньне работы партыйных і прафэсыянальных арганізацый будаўнікоў—вось комплекс пытаньняў, высунутых пленумам перад партыйнымі, гаспадарчымі і прафсаюзнымі арганізацыямі, ад вырашэньня якіх будзе залежаць пасьпяховае правядзеньне будаўнічага сэзону.

Барацьба за генэральную лінію партыі, супроць правага і «левага» апартунізму, ажыцьцяўленьне вялікіх задач трэцяга году пяцігодкі прад'яўляе жорсткае патрабаваньне—павысіць тэарытычны ўзровень працоўных мас. Патрабаваньне марысцыка-ленінскай тэарытычнай узброенасьці асабліва рэзка і ў першую чаргу паўстае ў адносінах камуністаў. Уздым палітычнай актыўнасьці працоўных мас, цяга іх да паўзьнаньня свайго тэарытычнага кругагляду, палітычнае выхаваньне новага пакаленьня партыі—усё гэта настойліва высоўвае партыйную асьнову ў лік важнейшых задач партыі. Між тым, дзе-нідзе ёсьць яшчэ яўнае неразуменьне ролі партыйнай вучобы, недапушчальныя адносіны да гэтага пытаньня. Пленум гаркому, паказаўшы на неабходнасьць рашучай барацьбы з недаацэнкай партвучобы, якая (недаацэнка) праяўляецца з боку раду парт'ячэек,—паставіў ва ўсю шырыню задачу ўсямернага паляпшэньня пастаноўкі справы ў партшколах, максымальнага набліжэньня зьместу заняткаў да кайтрольных задач прадпрыемстваў, поўнай увязкі іх «з задачамі, якімі жыве і за якія штодзённа вядзе барацьбу рабочая клясэ».

Пленум гарадзкога камітэту КП(б)Б па-бальшавіцку вырашыў вузлавыя задачы, што стаяць перад менскай партарганізацыяй на сёньняшні дзень, з усёй паўнатой выкрыў недахопы, якія ёсьць у пасобных зьвяньнях работы, даў выразную праграму барацьбы на рашаючых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Узброіўшыся пастановамі пленуму, менская гарадзкая партарганізацыя пад кіраўніцтвам гаркому і ЦК КП(б)Б будзе ўпэўнена працягваць свой шлях, перамагаючы труднасьці, што стаяць перад ёю, яшчэ шчыльней згуртуе свае рады вакол генэральнай лініі партыі і, даючы бязьлітасны адпор агентам клясавага ворага—правым і «левым» апартуністам, мабілізуючы масы на ажыцьцяўленьне бягучых лёзунгаў партыі, дабіцца новых рашаючых посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва, у справе ажыцьцяўленьня плянаў вялікіх работ трэцяга году пяцігодкі, завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

На пленуме ЦККК КП(б)Б

Аб рабоце Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б

(З дакладу тав. Калніна)

Работа Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі выразна вызначана пастановамі XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б). Уся дзейнасьць ЦККК КП(б)Б была накіравана на кіраўніцтва ажыцьцяўленьнем задач сацыялістычнага будаўніцтва, на бязьлітаснае змаганьне супроць ухілу ад генэральнай лініі партыі, наносячы разам з усёй паўнатой руйнуючы ўдар па агентуры клясавага ворага ў радах партыі—правым і «левым» апартунізьме, па ўсіх спробах апартуністычнага скажэньня ленінскай лініі партыі ў нацпытаньні. ЦКК пільна стаіць на варце ленінскага адзінства і маналіцтасьці родоў партыі, што зьяўляецца неабходнай і асноўнай зарукай далейшага пасьпяховага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, што зьяўляецца неабходнай умовай для пасьпяховага завяршэньня ў гэтым годзе пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

Аднак, у нашай рабоце ёсьць рад істотных недахопаў. На радзе важнейшых вучастках работы мы яшчэ слаба ажыцьцяўляем дырэктывы партыі. Прэзыдыум ЦККК УсеКП(б) па дакладу ЦКК КП(б)Б зусім правільна адзначыў шмат недахопаў у нашай рабоце.

Гэтыя недахопы заключаюцца ў слабай яшчэ арганізацыі масавага кантролю над дзейнасьцю савецкага апарату. У нас слаба наладжана сувязь органаў РСІ з прафсаюзамі для мабілізацыі мас на барацьбу з бюракратызмам. Вялікія хібы дапушчаны ў тым, што не пастаўлена рашучае пытаньне аб спыненьні перакідак на адказную работу тых кіруючых работнікаў, якія скампраматавалі сябе на далейшай рабоце. Ёсьць такія выпадкі, калі ў адносінах да вычышчаных з савецкага апарату некаторых чужых і бюракратычных элемэнтаў не рэалізаваны пастановы камісіі па чыстцы. Наогул слабых месц у нашай рабоце ёсьць многа. Задачай усіх органаў кантрольнай камісіі зьяўляецца ўзяць рашучы напрамак у справе ажыцьцяўленьня даных дырэктыў ЦКК УсеКП(б) па дакладу ЦККК КП(б)Б, цягнучы ў гэту работу шырокія партыйныя і рабочыя масы.

Ахарактарызаваўшы работу ЦККК РСІ па праверцы ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі на важнейшых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва ў галіне прамысловасьці, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, падрыхтоўкі кадраў, тав. Калнін падкрэсьліў, што да гэтага часу нездавальняюча наладжан кантроль і праверка нашых пастаноў. Пастановы-ж бяз іх практычнага ажыцьцяўленьня нічога значэньня ня маюць. На гэта пытаньне праверкі рэалізацыі пастаноў мы павінны рабіць галоўнейшы ўпор у сваёй рабоце.

У сувязі з правядзеньнем пікідацыйнай акруг у мэтах узмацненьня раёну, як асноўнага зьвяна сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы, важную ролю ў сыстэма работы партарганізацыі набываюць раённыя кантрольныя камісіі. Іх склад па сацыяльным становішчы на 70 проц. рабочых, 50 проц. членаў РайКК з партстажам да 1920 году. Раённыя кантрольныя камісіі ў такім складзе забясьпечваюць правільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Але нельга не адзначыць тэй акалічнасьці, што пасобныя раённыя партарганізацыі недаацэньвалі значэньня РайКК. Мы маем такія пасобныя выпадкі, што ў склад раённых кантрольных камісій былі выбраны такія камуністы, якія ў мінулым выключаліся з партыі за антыпартыйныя ўчынкі. Паміж пасобнымі райкомамі і кантрольнымі камісіямі няма належнай увязкі ў рабоце. Задача заключаецца ў ліквідацыі гэтых недахопаў, у далейшым узмацненьні РайКК работнікамі вытрыманымі партыйцамі.

Усе органы кантрольнай камісіі павінны забясьпечваць шырокае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі, не зважаючы на асобы, як важнейшай зброі ў змаганьні з апартуністычнымі і бюракратычнымі скажэньнямі партыйнай лініі, з рознымі нездаровымі зьявішчамі ў рабоце, выкрываючы і рашуча рэагуючы на ўсякія праявы заціску самакрытыкі і ініцыятывы мас.

**

16 лютага на ранішнім пасяджэньні пленуму па дакладу тав. КАЛНІНА выказалася 20 таварышоў.

Выступаўшыя таварышы падкрэсьлівалі, што адзначаныя ў пастанове ЦКК УсеКП(б) недахопы ў рабоце Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б у значнай меры зьяўляюцца вынікам слабай пастаноўкі работы многіх РайКК.

Задачы рэканструкцыйнага пэрыяду, якія ажыцьцяўляюцца ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня, ва ўмовах актыўнага супраціўленьня клясавага ворага разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню вымагаюць выразнай работы, выразнага правядзеньня клясавай лініі ўсімі зьвяньнямі дзяржаўнага апарату, гаспадарчых, каапэрацыйных і іншых органаў. У забясьпячэньне гэтай задачы праведзена вялікая работа. Партыя дасягнула значнага паляпшэньня работы савецкага апарату, правяўшы чыстку яго ад чужых і бюракратычных элемэнтаў. Але гэта не выключае таго становішча, што работа савецкага апарату, работа каапэрацыі ня досыць хутка перабудоўваецца ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду. Трэба дамагацца, каб сыстэма рабочага кантролю шляхам шэфства вытворчых прафсаюзаў над савецкім апаратам была ўзьнята на палітычную вышыню.

Значнае месца ў спрачках занялі пытаньні рацыяналізацыі вытворчасьці, скарыстаньня ўнутраных рэсурсаў і зьніжэньня сабекошту. Ажыцьцяўленьне гэтых задач знаходзіцца ў непарыўнай сувязі з выкананьнем вытворчай праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Таму, на факты невыкананьня дырэктыў партыі ў справе рацыяналізацыі вытворчасьці, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў на прадпрыемстве, на бюракратычныя адносіны з боку кіраўніцтва тых ці іншых прадпрыемстваў да прапаноў рабочых, да іх вынаходзтва—трэба рашуча рэагаваць.

Падрыхтоўка да будаўнічага сэзону праводзіцца вельмі марудна, шмат горш, чым у мінулым годзе. Адсутнасьць часамі кантролю над ходам будаўніцтва, неарганізаваная падрыхтоўка да будаўніцтва прыводзіць да таго, што ня толькі на выконваюцца дырэктывы партыі аб зьніжэньні сабекошту будаўніцтва, а дапускаецца яго ўзрастаньне. Напрыклад, на закладку фундаманту шэйнай фабрыкі ў Віцебску выдатковалі такую суму грошай, за якую павінна была быць пабудавана ўся фабрыка.

Падаючы факты прарываў у рабоце пасобных раённых партарганізацый (Барысаўская, Віцебская і інш.) па разгортваньні самакрытыкі, рад прамоўцаў гаварылі аб неабходнасьці больш рашучага змаганьня на месцах супроць недаацэнкі лёзунгу партыі аб шырокім разгортваньні пралетарскай самакрытыкі і прыцягненьні да суровай адказнасьці глушыцеляў самакрытыкі.

Разгул белага тэрору ў фашысцкай Польшчы

Масавыя вобыскі і арышты ва ўсім краі

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» паведамлялася ўжо аб масавых арыштах і вобысках у Варшаве. Польскі буржуазны друк ад 15 лютага падае, што масавыя вобыскі з Варшавы перакінуліся на правінцыю і адбываюцца на абшарах усяе фашысцкае Польшчы. У самой Варшаве, паводле афіцыйных даных праведзена звыш 100 вобыскаў і каля 50 чал. арыштавана па абвінавачваньні нібы ў прыналежнасьці да камуністычнай партыі.

У зьвязку з абвінавачэньнем ППС-лявіцы, нелегальнай партыяй, дэфэнзыва правядзіцца масавыя вобыскі і арышты **ва Львоўскім, Пазнанскім і Верхня-Сілескім ваяводзтвах** членаў гэтай рэвалюцыйнай работа-сялянскай арганізацыі. Паводле вестак фашысцкага афіцыёзу «Газэты Польскай» ад 14 лютага, вобыскі і арышты праведзены **ва Львове і павеце, у Перамышлі, Дарагабычу, Барыслаўлі, Губіцах, Бодычу, Ржэшове, Самборы, Кросьне, Саноку** і інш. Ва ўсіх гэтых гарадох закрыты камітэты ППС-лявіцы, будынкі іх апячатаны.

У Беластоцкім ваяводзтве, як падае «Кур'ер Віленскі» № 37, дэфэнзыва ліквідавала 3 камітэту ППС-лявіцы і нібы камітэт КПЗБ. Некалькі дзесяткаў чалавек арыштавана.

У Вільні па прыказу адной ночы праведзена 110 вобыскаў, пры гэтым, як піша орган віленскіх фашыстаў «Кур'ер Віленскі», захоплена нібы шмат камуністычнай літаратуры, **арыштавана 64 асобы.** Адначасова, як паведамляе паліцыя, нібы ліквідаваны акруговы камітэт КПЗБ. Адначасова праведзены масавыя вобыскі і па правінцыі, пры гэтым, усе павятовыя і раённыя сакратарыяты ППС-лявіцы закрыты, а будынкі апячатаны. Маса арыштаваных.

Сьледзтва супроць усіх арыштаваных у Вільні вядзецца, як піша газэта, прысьпешаным тэмпам, пад непасрэдным кіраўніцтвам пракурора надзвычайнай важнасьці Дэмэйцкага.

Ва „ўціхаміранай" Зах. Украіне

Польскі фашызм, пасьля нападзяканьня ім восьмае мінулага году крывавага украінскага пагрому, для задушэньня рэвалюцыйнага руху украінскіх працоўных мас, ня раз зьвяртаў афіцыйныя паведамленьні аб тым, што ў Зах. Украіне ўсё спакойна, што там, адным словам, наступіла «ціш да гладзь». Аднак, сяды-тады ў прэсе прарываўся весткі аб тым, што рэвалюцыйныя выступленьні працоўных мас супроць акупантаў ня спыняюцца, што карныя атрады не адкліканы і дзейнічаюць нават яшчэ і цяпер.

Мапархічнае віленскае «Слово» ў № 36 ад 14 лютага падае, што 12 лютага каля в. Чыжыкава невядомымі асобамі была абстрэляна фурманка, на якой ехаў камэндант мясцовага паліцэйскага пастарунку, вядомы сваім арыштам амэрыканскага журналіста Дэйля, разам з дзьвюма настаўніцамі польскіх школ. Камэндант і настаўніцы паранены. Нападаючыя ўцякілі. Пачалося сьледзтва.

Адначасова тая-ж газэта паведамляе, што ў хуткім часе пачнецца рад палітычных працэсаў супроць арыштаваных украінскіх «сабатажнікаў». Ужо адзін такі працэс пачаўся 13 лютага ва Львове супроць двух украінскіх вучняў па абвінавачваньні іх у прыналежнасьці да украінскай ваеннай арганізацыі.

Катаржны прысуд над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі

Фашысцкі «Кур'ер Віленскі» падае, што 13 лютага ў Віленскім акруговым судзе адбыўся працэс супроць двух студэнтаў Віленскага унівэрсытэту па абвінавачваньні нібы ў камуністычнай дзейнасьці. Абодва падсудныя—Акупевіч і Мінцава засуджаны на 6 год катаржных работ.

У Хапме вышэйшай сэсіяй Люблінскага акруговага суда прыгавораны на 6 год катаржных работ па абвінавачваньні нібы ў камуністычнай дзейнасьці селяніна Р. Шэпоб.

Сацыял-фашысцкія лёкаі—на чале антысавецкай кампаніі

Антысавецкія лаўры не даюць спакою нямецкім сацыял-прахвостам

БЭРЛІН, 14. Газэта «Бэрлінэр Тагеблат» паведамляе, што ў камісіі рэйхстагу па абсьледваньні дзейнасьці ўрадавага камітэту хлебнага манапалю адбыліся бурныя спрэчкі. Члены камісіі заявілі, што антысавецкія выпады ўрадавага камісара—сацыял-дэмакрата Бадэ, зусім пярэдпакоўныя. Бадэ ня раз выступаў з антысавецкімі заявамі, сьцьвярджаючы, што быццам савецкі дэмпінг зьяўляецца прычынай зьніжэньня цэн на жыта і што Савецкі Саюз нечакана зьявіўся на сусьветным хлебным рынку, пасьля таго, як была заключана нямецка-польская згода. **Члены камісіі канстатавалі, што гэтыя заявы няправільныя,** бо Нямеччыне было вядома аб надыходзячым экспарце савецкага жыта. Пры гэтым Савецкі Саюз экспартаваў жыта ў Нямеччыну яшчэ да заключэньня нямецка-польскае згоды. Камісія ўстанавіла, што **асноўнай прычынай зьніжэньня цэн на жыта зьяўляецца не савецкі дэмпінг, а зьніжэньне цэн на пшаніцу і на ячмень на сусьветным рынку.**

Жах чэскіх імпэрыялістаў перад посьпехамі пяцігодкі

ПРАГА, 11. У часе жарайных дэбатаў [illegible] прамовай выступіў лідэр нацыянал-дэмакратаў **Крамарж.** Закранаючы пытаньне аб узаемаадносінах з СССР, Крамарж задаў пытаньне: «Што мы будзем рабіць са сваёй сельскай гаспадаркай, калі СССР удасца рацыяналізаваць сваю прамысловасьць і сельскую гаспадарку. Як мы будзем абараняцца супроць нацыёнаў, калі яна будзе ажыцьцёўлена?». Крамарж рэзка выступіў супроць фабрыкантаў, якія, ганяючыся за прыбыткам, увозяць у СССР машыны. У заключэньне Крамарж выказаўся супроць заключэньня гандлёвага дагавору з СССР.

Белагвардзейскі бандыт заклікае да агульна-эўрапэйскага паходу супроць СССР

ВЕНА, 14. Выходзячая ў Вене фашысцкая газэта камэнтуе даклад белагвардзейца генэрала Сахарава ў Вепскім «т-ве рэвізіі мірных дагавораў» аб неабходнасьці агульна-эўрапэйскага паходу супроць СССР. Газэта выказваецца за эканамічную вайну супроць Савецкага Саюзу «не на жыцьцё, а на сьмерць».

Антысавецкая кампанія польскай фашысцкай прэсы

ВАРШАВА, 13. У прэсе пілеудчыкаў надзвычай багата за апошнія дні антысавецкіх выпадаў. Афіцыёзная «Газэта Польская» зьмяшчае сёньня вялікі антысавецкі артыкул, у якім усяляк даводзіць, што ня Польшча, а Савецкі Саюз рыхтуецца да вайны. Для доваду прыводзіць меўшую ў УССР месца дэманстрацыю пратэсту супроць белага тэрору на Зах. Украіне і супроць зьвярэтваў у Луцкіх засьценках, далей—выступленьні ў Тыраспалі ў сувязі з 13 гадавінай заходу Бесарабіі. У якасьці доваду вайны прыводзіць і ўрачыстае сьвяткаваньне 50-гідоваага юбілею Варашылава, а таксама выступленьні былога камуністычнага дэпутата польскага сойму Лапицкага на зьезьдзе МОПР'у ў Ленінградзе і інш.

Орган вайсковага міністэрства «Польска Збройна» прысьвячае артыкул ваеннаму мастацтву савецкай пяхоты. Асабліва непакоіцца тым, што ў Чырвонай армі маюцца добра падрыхтаваныя снайпэры (лепшыя стралкі). Газэта заляўляе, што з гэтым фактам неабходна лічыцца, і што трэба падумаць аб сродках процідзеяньня. Орган саюзу прамысловцаў «Кур'ер Польскі» таксама далучаецца да антысавецкай кампаніі, гаворачы аб «савецкім дэмпінгу» і заклікаючы да аб'яднаньня ўсе капіталістычныя краіны для барацьбы з савецкім экспартам.

Першы пленум Менскага гарсавету XIII скліканьня

Учора ў Доме Культуры адкрыўся першы пленум Менскага гарадзкога савету 13-га скліканьня.

Ад імя менскай гарадзкой выбарчай камісіі пленум адкрыў тав. Аксючыц. У сваім уступным слове тав. Аксючыц спыніўся на дасягненьнях і памылках у рабоце гарадзкога савету.

Пленум абраў прэзыдыум з 31 чал. у складзе т. т. Гея, Шаранговіча, Галадзеда, Рыжова, Рапапорта, Калініна, Кавальчука, Валодзька, Хацкевіча, Кеніга, Аксючыца, Шпэктарава і інш.

Пад доўга нясьціхаючыя воплескі абраецца гапаровы прэзыдыум: члены палітбюро ЦК УсеКП(б), т. т. Андрэеў, Тэльман, Ленскі і Корчык.

Дэлегацыя Заслаўскага паграпатраду, падшэфнага гарсавету, перадала менскаму гарадзкому савету баявое чэкісцкае прывітаньне.

Пленуму рапартавала таксама дэлегацыя Н-скага падшэфнага артпалка. Дэлегацыі запэўнілі новы склад гарсавету ў сваёй баявой падрыхтаванасьці да абароны Савецкай Беларусі.

Адказваў на прывітаньні тав. **ВАЛОДЗЬКА.**

З вялікім двухгадзінным дакладам ураду БССР выступіў старшыня СНК БССР—тав. Галадзед.

Сёньня ўвечары—спрэчкі па дакладу тав. Галадзеда і выбары новага прэзыдыуму Менгарсавету.

Закрыцьцё ўсесаюзнай нарады рабселькораў

МАСКВА. Увечары 16 лютага скончылася ўсесаюзная нарада па пытаньнях рабселькораўскага руху. Нарада ўхваліла рад рэзалюцый: аб задачах рабселькораўскага руху і кіраўніцтве ім, аб удзеньніцтве ў друку, аб адбрычна-заводзкім друку і яго ролі ў правядзеньні задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, аб калгасна-вёсковым і вёсковым незалежным друку і яго ролі ў сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі, аб падрыхтоўцы кадраў друку і вылучэньні рабселькораў, а таксама аб задачах нізавога друку і рабселькораў у сувязі з абаронай СССР.

ПРАВЯДЗЕНЬНЕ КАНТРАКТАЦЫІ—на ударны тэмп

БОЛЬШАСЬЦЬ КІРУЮЧЫХ РАБОТНІКАЎ ТУРАЎШЧЫНЫ ЯШЧЭ НЯ ЧЫТАЛА АДОЗВЫ ПАРТЫІ І УРАДУ. У ЖЛОБІНЕ, КЛІМАВІЧАХ І ХАЛОПЕНІЧАХ ЧАКАЮЦЬ... ДАДАТКОВЫХ ДЫРЭКТЫЎ

НЕДААЦЭНКА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ПАСТАНОЎ АБ КАНТРАКТАЦЫІ І ЗАЦЯГВАНЬНЕ ІХ РЭАЛІЗАЦЫІ—ПРОСТАЯ ДАПАМОГА КУЛАКУ

Правядзеньне кантрактацыі--на рэйкі сацспаборніцтва

ГАРАДОК. (Па тэлеграфу). Пленум Вайханскага сельсавету, Гарадоцкага раёну, прапрацаваўшы адозву СНК і ЦК аб кантрактацыі, пастанавіў неадкладна пачаць не рэалізацыю і дабіцца кантрактацыі ільну ў аднаасобных гаспадарках на 100 проц., а таксама выканаць пляны кантрактацыі і па іншых яравых культурах.

Сельсавет выклікаў на спаборніцтва па выкананьні плянаў кантрактацыі Аляксандраўскі сельсавет.

Сіманаў.

Кулацкай агітацыі не даецца адпору

ХАЛОПЕНІЧЫ. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі по павярнуліся тварам да кантрактацыі. Нішчай растлумачальнай работы не вядзецца.

Бязьдзейнасьць раённых арганізацый выкарыстоўвае кулак, які разгарнуў шалёную агітацыю за зрыў кантрактацыі. Кулацкай агітацыі не даецца адпору.

Аляксёнак.

У 31 раёне не прыступілі да кантрактацыі малака

Сыстэма сельска-гаспадарчай каапэрацыі выканала плян кантрактацыі малака ў калгасах на 69-ці раёнах на 39,6 проц., па індывідуальным сэктары—на 4,6 проц. Цьвёрдыя заданьні даведзены толькі да 1,29 проц. кулацка-заможных гаспадарак.

Зусім ня прыступлена да кантрактацыі малака ў 31 раёне. Сюды ўваходзіць 18 раёнаў з жывёлагадоўчым напрамкам, як Бярэзінскі, Веткаўскі, Камарынскі, Касьцюковіцкі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Пятрыкоўскі, Прапойскі, Пухавіцкі, Расьнянскі, Сьмілавіцкі, Тураўскі, Хойніцкі, Церахаўскі, Чырвонаслабодзкі, Чэрвеньскі, Юравіцкі, Дрыбінскі і 13 раёнаў ільнапяньковага напрамку—Чаўскі, Чырвонапольскі, Хоцімскі, Асьвейскі, Багушэўскі, Бушацкі, Высачанскі, Дрысенскі, Кругланскі, Расонскі, Сеньненскі, Сураскі і Халопеніцкі.

Урад БССР абавязваў сыстэму сельска-гаспадарчай каапэрацыі і мясцевыя органы ўлады правесьці ўсю работу па кантрактацыі малака да 15 сьнежня з такім разьлікам, каб малако паступала ў гарады роўнамерна, улічваючы лактацыйны перыяд.

Паданьня лічбы кантрактацыі гаварыць аб тым, што на месцах у гэтай галіне пішкай работы не вялося. Апэрацыйныя арганізацыі спадзяваліся толькі на самацёк.

Разважаньні некаторых мясцовых работнікаў аб тым, што, мэй, цяпер не сэзон, пасьля ацёлу будзе малако, зусім несур'ёзныя. У цяперашні час ацёл наступіў, а малако ў гарады ўсё-ж не паступае. У той-жа час на вольным рынку малака колькі хочаш.

Спушчаныя пляны кантрактацыі ляжаць бяз руху і не даведзены да кулацка-заможных двароў. Работнікі сельска-гаспадарчай каапэрацыі не падштурхваюць у гэтай работе сельсаветы. Асабліва дрэнна пастаўлена работа ў індывідуальным сэктары. Вакол пытаньняў кантрактацыі малака і загатоўкі малочных прадуктаў не мабілізавана грамадзкая думка, не вядзецца работы в беднатой, з вясковым актывам.

За бязьдзейнасьць па кантрактацыі і загатоўцы малака праўленьне Белмалжывсаюзу вынесла з работы і аддано пад суд старшынь Асіпавіцкага і Барысаўскага райкаапсаюзаў, абвясьціла вымову Каморынскаму і Рэчыцкаму райкаапсаюзам.

Нарады, якія былі праведзены Белмалжывсаюзам у раёнах, паказалі, што кантрактацыі малочнай прадукцыі на месцах не аддаецца пішкай увагі. Некаторыя калгасы нават ня ведаюць куды здаваць малако.

Такой апартуністычнай бязьдзейнасьці і нядбайнасьці з боку сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі да выкананьня плянаў кантрактацыі малака і загатоўкі малочнай прадукцыі павінен быць положан канец. Гэта работа павінна быць пастаўлена ў цэнтр увагі ўсіх мясцовых арганізацый.

Журомскі.

15 кіруючых работнікаў яшчэ ня чыталі адозвы

ТУРАЎ. Райза і райкалгасаюз нічога практычнага не зрабілі для рэалізацыі гістарычнай адозвы СНК і ЦК партыі аб кантрактацыі яравых. На нарадзе загадчыкаў раённых устаноў выявілася, што з 20-ці кіруючых раённых работнікаў 15 назад ня чыталі адозвы.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы кантрактацыі ў Тураўскім раёне.

АБАВА.

Да рэалізацыі дырэктывы не прыступілі

КЛІМАВІЧЫ. Ня гледзячы на сваячасова даныя вказаньні КПБ аб арганізацыі аб шырокай папуляризацыі сярод калгасных і адзіласобных бядняцка-сераднякіх мас адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі, у гэтай справе яшчэ бліжкага зруху. **Партячэйкі і сельсаветы нічога практычнага не зрабілі для таго, каб калгаснікі, адзіласобнікі—бядняк і серадняк ведалі аб тых вялізарных укладаньнях, якія выкачаюцца савецкай дзяржавай на справу сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, аб карысьці кантрактацыі і тых пільготах, якія асабліва калгаснік атрымлівае па кантрактацыі.**

Некаторыя раённыя арганізацыі працяўляюць поўную бязьдзейнасьць у галіне рэалізацыі дырэктыў аб кантрактацыі. Райкалгасаюз, райзапасы, райтаргаль, упаўнаважаны на пастачанні ўсё яшчэ чакаюць спэцыяльных дырэктыў.

Кмітоўскі.

ТАВ. ГЕЙ НА 1-м ПЛЕНУМЕ ГОМЕЛЬСКАГА ГАРСАВЕТУ

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.).

Ва ўрачыстай абстаноўцы ў гомельскім гарадзкім тэатры 14 лютага адкрыўся 1-шы пленум гарсавету XIII скліканьня. У рабоце пленуму прыняў удзел сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гей.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія гарсавету прайшла пад вялікай актыўнасьці гомельскага пролетарыяту. На сходах прысутнічала 83 проц. усіх выбаршчыкаў супроць 25 проц. пры мінулых выбарах. У новы склад гарсавету выбрана 325 дэлегатаў, з і

Работу вытворчых партарганізацый — НА ВЫШЫНЮ ТЭМПАЎ ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

Перабудовай партработы, правільнай расстаноўкай партыйных сіл, яшчэ большым павышэньнем актыўнасьці рабочых мас забясьпечым поўнае выкананьне вытворчых праграм бягучага году

Партработу на прадпрыемстве

падпарадкаваць задачы выкананьня вытворчых праграм

Выначаная партыяй праграма на трэці рашаючы год пяцігодкі ставіць перад вытворчымі партарганізацыямі рад вялікай палітычнай важнасьці задач. Галоўная з іх — забясьпечыць поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Гэтай асноўнай задачы павінны быць падпарадкаваны ўсе другарадныя, ёй павінна быць падпарадкавана ўся дзейнасьць і практычная работа вытворчых партарганізацый.

Калі мы прасочым работу нашых вытворчых партколектываў, то мы ўпэўнімся, што яны ў асноўным павярнуліся гварам да вытворчасьці, што яны шчыльна падышлі да вырашэньня гаспадарчых пытаньняў. Але тут асноўная бяда заключаецца ў тым, што ў рабоце раду партыйных дзеек фабрык і заводаў вельмі мала канкрэтнасьці. Ёсьць яшчэ такія пасобныя партколектывы, якія зацвердзелі разгортаньня бачной работы на мабілізацыі мас на выкананьне прамфінпляну тэмпаўца на месяц, выносяць ягульныя, неканкрэтныя пастановы, а часамі нават уносяць блытаніну ў вырашэньне тых ці іншых надзвычай важных пытаньняў работы на вытворчасьці.

Асобныя, нават кіруючыя, партработнікі лічаць, што яны ўжо цалкам перабудавалі работу ў адпаведнасьці з задачамі трэцяга году пяцігодкі толькі таму, што пытаньні гаспадарчага характару займаюць у іх рабоце вялікую ўдзельную вагу. Справа ня ў тым, колькі пытаньняў вырашана, а ў тым, як яны вырашаны і наколькі ад гэтага вырашэньня выгрывае справа выкананьня прамфінпляну, наколькі гэта вырашэньне дапамагае высокім тэмпам работы прадпрыемства.

Задача партыйнай арганізацыі на вытворчасьці заключаецца ў тым, каб партарганізацыя перабудавала ўсю сваю работу ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі рэканструкцыйнага нэрыяду, каб партарганізацыя рашуча вышыбала з практыкі сваёй работы неканкрэтнасьць, тапканьне на месцы. Пад якім-ка кутом погляду павінен быць пабудаваны зьмест партыйнай работы. У гэтых адносінах я хачу высунуць некалькі прапаноў.

Вытворчае заданьне — да кожнага рабочага

Давядзеньне прамфінпляну да варштату не па словах, а на справе, узмацненьне работы на разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва — галоўныя моманты, вакол якіх трэба сканцэнтраваць асноўную ўвагу партыйных арганізацый. Калі мы возьмем рад прадпрыемстваў і праверым, то ўпэўнімся, што яшчэ ня ўсюды сапраўды даведзен прамфінплян да варштату. У той час, як давядзеньне пляну да варштату, да кожнага рабочага — адзін з важнейшых элементаў забясьпечэньня выкананьня праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Кіраўніцтва і шырокае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, стопроцантны ахоп імі рабочых мас трэба паставіць на першае месца ў рабоце ячэек. Гэта мы ставім з усёй вострасьцю таму, што ў радзе месц у справе разгортваньня ўдарніцтва і сацспаборніцтва панае пейкі холадок. Аб гэтым выразна гаворыць выкананьне прамфінпляну за студзень месяц. Рад прадпрыемстваў, праўда, выканаў прамфінплян на 100 проц. Аднак, ёсьць і такія фабрыкі і заводы, якія выйшлі з студзеня месяца, выканаўшы прамфінплян на 80-90-94 проц. Гэта датычыць нават такіх буйных прадпрыемстваў, як «Камунар», «Кастрычнік», «Энэргія». Гэта разультат таго, што партыйныя арганізацыі ня здолелі яшчэ на вышэйшую ступень, узьняць актыўнасьць рабочых мас, накіраваць іх на поўнае выкананьне прамфінпляну. Тут-жа трэба надкрэсьліць, што ў радзе парт'ячэек камуністы не зьяўляюцца ініцыятарамі ў разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Ёсьць парт'ячэйкі, дзе камуністы толькі на 46 проц. ахоплены сацспаборніцтвам.

Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, падымаючы яго на вышэйшую ступень, укараняючы сацыялістычныя метады працы на кожным заводзе і фабрыцы, партыйныя ячэйкі павінны павесьці бязьлітасную змаганне супроць **прастоўў, недагрузкі рабочага дня, перабояў у рабоце цэхаў, брыгады** і інш. момантаў, якія перашкаджаюць выкананьню прамфінпляну. Рабоце на гэтым вучастку павінен быць наданы сапраўды баявы характар. Тым больш, што барацьба з прастоямі на поўным вучастку вытворчасьці, з непаладкамі, з перабоямі ў рабоце варштату а боку парт'ячэек і партгруп не ўвайшла яшчэ ў штодзённую сыстэматычную калёіну работы ячэек. Ад перабояў, прастояў і непаладак начынаюцца прарывы ў выкананьні прамфінпляну. Таму змаганьне з гэтымі асноўнымі перашкодамі ў выкананьні прамфінпляну павінна быць пастаўлена ў цэнтр увагі ўсёй партарганізацыі на вытворчасьці.

Пытаньне поўнай загрузкі рабочага дня стаіць перад намі, як адно з важнейшых. Наводзе даных ВСНГ на радзе прадпрыемстваў, там, дзе ўведзен 7-гадзінны дзень, часамі працуюць нават толькі 6 паўнаўных гадзін. Трэба выявіць канкрэтныя факты і прычыны недагрузкі і самым рашучым парадкам яе выкараняць на кожным прадпрыемстве, дзе яна тэмпі праяўляецца.

Правільна расставіць партыйныя сілы

Расстаноўка партыйных сіл на вытворчасьці ў даны момант адыгрывае надзвычай вялікую ролю. Трэба зусім адкрыта сказаць, што на пасобных прадпрыемствах кіраўніцтвы партыйных арганізацый зусім не займаліся гэтым важнейшым пытаньнем. Расстаноўка партыйных сіл адбывалася самацёкам. У тых цэхах, дзе парт'ячэйкі расьлі шпарчэй, там партыйная праслойка сярод рабочых большая, там-жа, дзе быў марудны рост парты, там зусім станоўчая аварочвае. І характарна, што бюро парткалектываў ня ўжывала ніякіх мер, каб рэгулямэнтаваць расстаноўку сапраўдных сілы, каб гэта расстаноўка забясьпечвала баявы тэмп работы кожнага цэху.

Расстаноўка партыйных сіл павінна адпаўнаць вялікае месца ў рабоце партарганізацый на вытворчасьці. У аварочным вышыбу мы будзем паўтараць тыя прарывы, якія мелі месца ў закрэпным цэху фабрыкі «Кастрычнік», у ліцейным цэху на заводзе «Камунар». Аналіз гэтых прарываў паказаў, што яны здарыліся імецна таму, што тыя кадры, якія працавалі ў гэтых цэхах, не адпавядалі свайму прызначэньню. Разам з роўнамерным размеркаваньнем партыйных сіл нам трэба да ўсю шырыню паставіць пытаньне аб перакваліфікацыі пасобных комуністаў. Праўда, гэта ня ўсюды магчымна, але ў радзе выпадкаў на гэты шлях мы павінны стаць.

Парт'ячэйкі павінны цьвёрда памятаць, што расстаноўка партыйных сіл зьяўляецца пытаньнем, якое пры правільным вырашэньні забясьпечыць выкананьне прамфінпляну на фабрыцы і заводах.

Партнагрузцы надаць вытворчы характар

Наступнае пытаньне — аб зьмене характару партнагрузкі. Я лічу, што мы павінны стаць на шлях карэннага зьмен самога характару партнагрузкі. Аб гэтым мы шмат гаворым, але пакуль што ня ўходзім у практыку нашай работы. Партнагрузку трэба пранізаць вытворчым зьместам. Напрыклад, у сыроку нагрузак трэба ўвесьці такія, як арганізатары вытворчага сэктару арганізатары праверкі рэалізацыі рабочых працыноў і цэлы рад іншых, якія маюць вытворчы характар і забясьпечваюць правядзеньне ў жыцьцё важнейшых вытворчых задач. Гэтым трэба паказаць на тое, што нагрузку нельга лічыць, як нешта пастаннае, незьмяннае. Характар нагрузкі, павінен зьмяняцца ў адпаведнасьці з тымі задачамі, якія паўстаюць на тым ці іншым адрэзку часу. Напрыклад, у даны момант на прадпрыемстве шмат прастояў. Значыць трэба ўвесьці рад такіх абавязкаў, нагрузак, якія-б забясьпечылі ліквідацыю гэтага непармальнага зьявішча. І калі, скажам, прастоі ліквідаваны і паўстае другая задача, то зараз-жа трэба пераключыцца на тое, каб усе сілы накіраваць на выкананьне гэтай чарговай задачы. Падкрэсьліваю, што да нагрузкі трэба падыходзіць, як да справы, якая вынікае са становішча на той ці іншы нэрыяд, што тут патрэбна вялікая гібкасьць і паваротлівасьць партыйных арганізацый, а не заказацыёлы стандарт.

Быць сапраўдным перадавіком

Камуністы павінны быць сапраўднымі перадавікамі на прадпрыемствах. Партыйны — вядучая група на фабрыцы і заводзе. Гэта зусім бясспрэчнае палажэньне.

Аднак, у нас побач з тым, што камуністы ў асноўнай сваёй масе падаюць сапраўды большавіцкія ўзоры змаганьня за прамфінплян, ёсьць ня мала прыкладаў, калі пасобныя партыйцы зьяўляюцца хвасьлістамі і дэзарганізатарамі вытворчасьці. Пасобныя парткалектывы не заўсёды трымалі над сваім штодзённым нагляданам камуністаў, не правяраюць, наколькі яны каля варштату зьяўляюцца прыкладам для ўсёй масы беспартыйных рабочых. Некаторыя парткалектывы часамі заслухоўвалі індывідуальныя справаздачы партыйцаў, але гэтага мала. Парткалектывы павінны стаць на шлях сапраўднай праверкі таго, наколькі камуністы адыгрываюць вядучую ролю на прадпрыемстве; павінны жорстка раскрытыкаваць дрэнныя паводзіны камуніста каля варштату, працэсы, якой якасьці дае прадукцыю партыец і які ён прымае ўдзел у змаганьні за якасьць і ў жыцьці ўсяго прадпрыемства.

Парткалектывы павінны выкрываць і бязьлітасна гнаць са сваіх радоў усякага роду апартуністаў, кулацкіх агентаў і тых, хто ня здолен па-бальшавіцку змагацца за высокія тэмпы работы сацыялістычнай прамысловасьці.

На змаганьне за якасьць

Асобна трэба паказаць на пытаньне барацьбы за якасьць прадукцыі, бо на абмеркаваньні дзень гэта адно з вялікіх пытаньняў змаганьня за прамфінплян. Паход за якасьць, арганізацыя ўзорных брыгад, інстытуту ініцыятараў у змаганьні за якасьць і г. д.—вось пытаньні, якія павінны быць пастаўлены на парадак дня партыйных ячэек. Партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах павінны ўкараніць у сьвядомасьць рабочых тое палажэньне, што лепшым ударнікам зьяўляецца той, хто выконвае ня толькі колькасныя паказальнікі прамфінпляну, але і самаддана змагаецца за якасьць.

У Менскай арганізацыі толькі тры прадпрыемствы («Бальшавік», Камунар» і «Энэргія») пераключылі сваю работу на змаганьне за якасьць. Гэта выразна гаворыць аб тым, што партарганізацыі раду іншых прадпрыемстваў недаацэньваюць усяго таго вялікага значэньня, якое мае на сёнешні дзень пытаньне павышэньня якасьці прадукцыі, барацьбы супроць браку, супроць перабояў і г. д.

Аб арганізацыйных формах і структуры ячэек

Нарэшце, некалькі заўваг наконт арганізацыйных форм і структуры ячэек менскай арганізацыі.

Мы ў нашай арганізацыі шмат гаварылі аб рабоце цэхавай ячэйкі. Трэба падкрэсьліць, што да недахопаў у рабоце цэхавых парт'ячэек адносіцца неканкрэтнасьць, слабая ініцыятыўнасьць, няўменьне ўхапіцца за галоўнае і ліквідаваць недахопы на-ходу. Калі мы ліквідуем гэтыя недахопы ў рабоце цэх'ячэек, то яны стануць сапраўды асновай нашых партарганізацый на прадпрыемствах, стануць сапраўднымі арганізатарамі мас вакол важнейшых палітычных задач партыі. Разам з гэтым нельга абмінуць і таго, што на дробных прадпрыемствах цэхавыя парт'ячэйкі сябе поўнасьцю не апраўдалі.

У далейшым відавочна, прыдзецца паставіць пытаньне аб тым, што ня ўсюды можна ствараць цэхавыя ячэйкі, бо ў радзе месц («Камунарка», Эльвод), яны аказаліся нежыцьцёвымі.

Аб партгрупах. Як у нас стаяла гэта пытаньне да апошняга часу? У радзе арганізацый займаліся вылучэньнем парторганізатараў, і на гэтым справа канчалася. Зусім правільна паставлена работа і арганізацыйная структура партгруп на гарбарні «Бальшавік». Там у кожным аддзяленьні, брыгадзе, ці вучастку, дзе ёсьць тры камуністы, афармляецца партыйная група. Парторг выбіраецца, а не прызначаюцца зьверху. Групорг адчувае адказнасьць перад выбаршчыкамі. Партыйная група, як правіла, павінна быць па ўсіх нашых прадпрыемствах, дзе ёсьць і дзе няма цэхпарт'ячэек. Гэта трэба перанесьці на ўсе нашы прадпрыемствы. Бліжэйшы месяц — сакавік павінен быць спэцыяльна прысьвечан рабоце па афармленьні партгруп і выбараў групоргаў. Пры гэтым у практычнай рабоце трэба стаць на шлях скліканьня сходаў партыйных груп па мясцовых пытаньнях у аддзяленьні, брыгадзе і г. д. Перанясеньнем раду пытаньняў на вырашэньне патрэбуе мы разгрузім нашы парткалектывы і цэх'ячэйкі ад раду пытаньняў і падегчым работу ўсяго парткалектыву.

Работа ў зьменах да гэтага часу ў нас пастаўлена слаба. Трэба ўжыць усе меры да таго, каб не рашучым парадкам узмацніць, унёсшы поўную яснасьць у работу зьменных парт'ячэек. Пытаньне аб работе ў зьмене трэба вырашыць такім парадкам: выбраць зьменавага партарганізатара, які-б адказваў перад парткалектывам і цэх'ячэйкай за зьмену, які-б атрымліваў цьвёрдыя дырэктывы па пытаньнях партыйнай работы ў зьмене ад бюро ячэйкі. Добры вопыт партработы ў зьменах ёсьць на «Кастрычніку». Яго трэба перанесьці і на іншыя прадпрыемствы.

Апошняя заўвага адносна сэктараў. Сутнасьць сэктарнай сыстэмы зводзіцца да максымальнай канкрэтызацыі работы нашых партыйных ячэек. Але часамі сэктары кашэруюць работу аддзелаў, партыйных камітэтаў. Па-мойму, канкрэтызацыя кіраўніцтва павінна пайсьці на шлях разгортваньня функцыянальнай сыстэмы. Пры цэхавых парт'ячэйках трэба мець тры сэктары: масавай работы, вярбоўкі ў партыю і вучэбы.

***

Уся работа на перабудове павінна быць падпарадкавана асноўнай задачы: змаганьню за выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі, змаганьню за поўнае выкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Толькі вядучы бязьлітаснае змаганьне супроць правых апартуністаў — кулацкай агентуры ў радах партыі і трэцэдыву «левага» апартунізму, партарганізацыі здолеюць па-бальшавіцку выканаць тую праграму, якая вызначана сьнежаньскім пленумам ЦК УсеКП(б) і студзеньскім пленумам ЦК КП(б)Б. **Г. Шпэктараў.**

У змаганьні за пяршынства

Перабудова партработы на зав. „Пралетары“ забясьпечыла посьпехі ў выкананьні прамфінпляну

Ідэйнае ўзмацненьне партыйнага калектыву, бязьлітасная барацьба з апартунізмам ва ўсіх яго праяўленьнях, арганізацыйная перабудова партыйнай работы на прадпрыемстве, мабілізацыя творчай актыўнасьці мас на ліквідацыю прарываў у выкананьні вытворчай праграмы — зьяўляліся асноўнай задачай у рабоце партыйнага калектыву заводу **«Пралетары»** (Гомель) пасьля замены (сакавік 1930 г.) апартуністычнага кіраўніцтва заводу.

Натрабавалася вялікае напружаньне сіл, каб вывесьці завод ня толькі з таго ганебнага становішча, да якога яго давялі былыя кіраўнікі, што апанаваліся ў палоне апартунізму, а заняць перадавое месца сярод буйнейшых прадпрыемстваў БССР у ажыцьцяўленьні задач сацыялістычнага будаўніцтва. Наносячы руйнуючы ўдар па праўленьнях прынцэта апартунізму ў тэорыі, выкрываючы апартуністычную практыку, партыйны калектыў шчыльна падышоў да перабудовы сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі найлепшага забясьпечэньня выкананьня прамфінпляну. У мэтах перанясеньня ўсяго цяжару масавай работы ў нізавыя вытворчыя зьвенні, перш-на-перш **праведзена была рэарганізацыя цэхавых ячэек, якая заключалася ў кольканым іх павялічэньні.** Раней існуючыя чатыры цэхавыя парт'ячэйкі рэарганізаваны ў шэсьць. Такім чынам, у асноўных бу́йнейшых цэхах меліся парт'ячэйкі, якія адказваюць за работу ў цэху, пашыраўся і рос на практычнай рабоце партыйны актыў. Павялічыўся партыйны ўплыў на работу ўсяго цэху.

На працягу ўсёй сваёй работы партыйны калектыў вёў неаслабную барацьбу супроць апартуністычнай практыкі, аддаючы вялікую ўвагу забясьпечэньню кіруючых пастоў партыйнамі, здольнымі на - большавіцку змагацца за паўсьпяшнае правядзеньне ў жыцьцё партыйнай лініі Бюро парткалектыву крымушана было ўжыць рашучыя арганізацыйныя меры ў адносінах да кіраўніцтва тых цэхавых парт'ячэек, якія не забясьпечвалі пасьпяховага выкананьня прамфінпляну, з прычыны на яднасьці ў іх рабоце права-апартуністычнай практыкі (ячэйка мэханічнага цэху) Кіраўніцтва гэтай цэх'ячэйкі аказалася нездольным узьняць на прынцыповую вышыню барацьбу з апартуністычнай практыкай. Рад камуністаў не разумелі сутнасьці і небясьпекі права апартунізму. Некаторыя партыйцы, імкнучыся апраўдаць сваю апартуністычную практыку, заяўлялі: «Я рабочы-токар і ні ў якім выпадку не магу быць апартуністам».

З дапамогаю ўсяго парткалектыву ячэйка мэханічнага цэху жорстка ўдарыла па апартуністычнай практыцы і ўзяла правільную лінію ў сваёй рабоце. На канкрэтных фактах барацьбы з апартунізмам выхоўваўся шэф партыйны і рабочы калектыў, павялічыў сваю актыўнасьць у рабоце за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Яўная агентура кулацкага ворага, непапраўныя праваапартуністычныя элементы бесперапынна выкідваліся з партыйных радоў.

Побач з узмацненьнем работы ў цэхах яна перасоўвалася і ўзмацнялася ў брыгадах і вытворчых групах. Усяго на заводзе налічваецца 29 брыгад і вытворчых груп, 11 партыйных груп. Ні адно вытворчае пытаньне не праходзіла без абмеркаваньня брыгадамі. Усе асноўнейшыя пытаньні, зьвязаныя з вытворчасьцю, а таксама гаспадарча-палітычныя кампаніі пачыналіся праводзіцца ад брыгад.

Сакратар парткалектыву З. ЧУХМАН.

Наколькі ўзрастала актыўнасьць і творчая ініцыятыва рабочых мас заводу і наколькі партыйная арганізацыя здолела быць на чале гэтай актыўнасьці ў змаганьні за аяжыцьцяўленьне лёзунгу выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, паказвае той факт, што работы пры абмеркаваньні прамфінпляну на асобны квартал **высунулі сустрэчны план з павялічэньнем на 28 проц. Прамфінплян на 1931 год павялічан рабочымі на 17 проц. супроць заданьня. Нагоўм-жа вытворчая праграма заводу на гэты год павялічана на 95 проц. у параўнаньні з мінулым годам. Прамфінплян шырока абмяркован сярод рабочых і зграз дведзен ня толькі да самых ніжэйшых вытворчых зьвеньняў, а да кожнага рабочага.**

Самым дадатнім у перабудове работы зьяўляецца тое, што партыйныя ячэйкі здолелі своячасова рэагаваць на ўсякія найменшыя недахопы на вытворчасьці, падхапляць узрастаючую ініцыятыву і актыўнасьць рабочых і ўзьнімаць яе на вышэйшую ступень. Важнейшы момант у перабудове работы — гэта **апэратыўнасьць і канкрэтнасьць у кіраўніцтве.** Усякая новая ідэя і ініцыятыва рабочых, накіраваная на палепшэньне вытворчасьці, знаходзіць з боку парт'ячэек падтрыманьне і пашыраецца на іншыя вытворчыя адзінкі, на ўвесь завод. Калі ўдарная брыгада ліцейшчыкаў узьняла пытаньне аб арганізацыі «сквозной» брыгады, дык гэта ідэя была хутка пашырана на ўвесь завод. Кацельны цэх першым на прадпрыемстве правяў ініцыятыву скарачэньня тэрміну выкупу навыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» і дадатковай падпіскі на яе. Гэтую ініцыятыву падтрымалі рабочыя ўсяго заводу. Такім-жа парадкам зараз вядзецца барацьба за якасьць прадукцыі. Яшчэ летам мінулага году комуністычны кацельны цэх паставіў перад сабой задачу — дабіцца лепшай якасьці прадукцыі і зьвядзеньня да мінімуму браку. Арганізаваным парадкам з ліку вядомых лёзунгамі рабочыя адносьлі на насіцях брак у чыгуна-ліцейны цэх, арганізавалі там мітынг, заключылі паміж сабой дагавор на выпуск лепшай якасьці прадукцыі. Такі мэтад паўтараў і арматурны цэх у асобным квартале.

Работы заводу ня толькі кутка чэмхаплялі ідэі іншых перадавых заводаў (сустрэчны прамфінпляны, «сквозные» брыгады і інш.), але часта высоўвалі свае новыя формы і вопыт работы, чым дапамагалі іншым заводам (дапамога заводу імя Ланцуцкага на прапраноў цы сустрэчнага прамфінпляну, фабрыцы «Праца» і інш.). Новай ідэяй, якая высунута рабочымі заводу «Пралетары» зьяўляецца канфэрэнцыя ліцейшчыкаў гораду па барацьбе з бракам і месячнай праверкі рэальнасьці сустрэчнага прамфінпляну.

У асобным квартале **парт'ячэйка арматурнага цэху высунула новая форма грамадзкай работы,** якая заключалася ў тым, што асобныя ўдарныя брыгады ўзялі шэфства над слабымі вучасткамі работы грамадзкіх арганізацый на прадпрыемстве. Гэта новая форма дадатняя ў тых адносінах, што яна яднае ўдарніцтва ля варштату з ударнай работай на лініі грамадзкай.

Разгортваньне новых вышэйшых форм сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, што зьяўляецца вынікам росту актыўнасьці і творчай ініцыятывы рабочых, забясьпечыла ня толькі ліквідацыю тых буйнейшых прарываў у выкананьні прамфінпляну, якія мелі месца на заводзе ў часе апартуністычнага кіраўніцтва, а і перавыкананьне вытворчай праграмы на колькасных і якасных паказальніках. **Прамфінплян асобнага кварталу выкананы на 108 проц.** Гэтыя посьпехі зьяўляюцца вельмі паказальнымі, як рабочы калектыў заводу пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі змагаўся за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Магутным фактарам у справе барацьбы за ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны, за палепшэньне якасьці прадукцыі, за выкарчоўваньне апартуністычнай практыкі ў рабоце зьявілася заводская газэта **«Вагранка».** Усе віды масавай работы на прадпрыемстве былі падпарадкаваны асноўнай задачы — выкананьню прамфінпляну. Рабочыя ў цэхах, брыгадах, вытворчых групах **праз кожныя 10 дзён інфармуюцца аб кодзе выкананьня прамфінпляну** і аб прычынах недахопаў, якія ёсьць на прадпрыемстве. Злосныя прагульшчыкі, нядбайнікі да працы, якія дапускаюць брак у сваёй рабоце, вывешваюцца на чорную дошку, выносяцца на суд рабочай грамадзкасьці заводу.

Партыйны калектыў забясьпечыў сапраўдную арганізацыю сацыялістычных мэтадаў працы на прадпрыемстве і, дзякуючы вялізарнай актыўнасьці рабочых мас, завод заняў па сваёй прадукцыйнасьці, па пасьпяховым выкананьні прамфінпляну адно з першых месц сярод буйнейшых прадпрыемстваў БССР. За гэтыя посьпехі, за сапраўдныя ўзоры комуністычнай працы на вытворчасьці **завод «Пралетары» ўзнагароджан сьцягам ЦК КП(б)Б.**

Перабудовай партыйнай работы на прадпрыемстве мы дасягнулі таго, што зараз **85 проц. рабочых усяго заводу ахоплены ўдарніцтвам,** партыйны калектыў вырас за 9 месяцаў на 130 чалавек за лік перадавых рабочых—лепшых ударнікаў, уступіўшых у партыю. Партыйны калектыў і рабочыя заводу ня спыняюцца на дасягнутых посьпехах, яны напружваюць усе сілы, каб канчаткова зьнішчыць недахопы ў рабоце на прадпрыемстве і ў максымальныя меры забясьпечыць выкананьне задач партыі, пастаўленых у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

З. ЧУХМАН.

А. Чарвякоў

Да вынікаў справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў

У выніку вялізарнейшых посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва краіна Саветаў уступіла ў нэрыяд сацыялізму. Выкананьне задач бягучага трэцяга году пяцігодкі — рашаючага году па ажыцьцяўленьні пяцігодкі — за чатыры гады — завершыць пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі СССР.

Узьняць ролю саветаў у барацьбе за генэральную лінію партыі

Пераможнае разгортваньне сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце выклікае шалёнае супраціўленьне з боку адміраючых клясаў, абвастраючы клясавую барацьбу і павялічваючы пагрозу нападу на Савецкі Саюз і яго фарпост — БССР з боку імпэрыялістычных інтэрвэнтаў. Рабочыя і сялянне адказваюць на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць краіны Саветаў яшчэ больш пасьледоўным, яшчэ больш рашучым сацыялістычным наступленьнем на ўсім фронце і ўсямерным узмацненьнем абароназдольнасьці краіны.

Выкананьне гэтых задач патрабуе далейшага напружаньня ўсіх сіл рабочае клясы і ўсіх працоўных для выкананьня задач сацыялістычнага будаўніцтва шляхам разгортваньня сацыялістычных форм працы, рашучай перабудовы работы ўсіх арганізацый у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага нэрыяду.

Таму перавыбары саветаў у гэтым годзе маюць найвялікшае палітычнае значэньне. Асноўнай задачай перавыбарчай кампаніі гэтага году зьяўляецца перабудова на справе ўсёй работы саветаў у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага нэрыяду, узьняцьце ролі саветаў, у барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць апартунізму. Асабліва важнае значэньне набылі ў гэтым годзе перавыбары саветаў на вёсцы ў сувязі з праведзенай ліквідацыяй акруг.

Зараз ужо скончыліся перавыбары сельскіх саветаў, канчаюцца раённыя зьезды саветаў і перавыбары гарсаветаў. БССР рыхтуецца да X ўсебеларускага зьезду саветаў.

Такім чынам важнейшая частка справаздачна-перавыбарчай кампаніі — перавыбары сельскіх, раённых і гарадзкіх саветаў, праз якія ажыцьцяўляецца наўніжэньне партыйнага і савецкага апарату да мас, да вёскі, да калгаснікаў,— ужо скончана.

Мы павінны падвесьці вынікі гэтай кампаніі для таго, каб на падставе вывучэньня вопыту перавыбараў саветаў рабіць патрэбныя захады да замацаваньня дасягнутых посьпехаў у справе перабудовы работы саветаў у адпаведнасьці з задачамі барацьбы за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Кажучы аб перабудове работы саветаў, мы павінны прыняць таксама ўсе крокі да таго, каб зьмяніць адносіны да саветаў з боку ўсіх арганізацый, паярнуць іх тварам да саветаў, устанавіць правільнае разуменьне ролі саветаў у сацыялістычным будаўніцтве, **узмацніць партыйнае кіраўніцтва саветамі.**

Саветы зьяўляюцца органамі пралетарскай дыктатуры, праз якія партыя і рабочая кляса ажыцьцяўляюць кіраўніцтва дзяржавай і сацыялістычным будаўніцтвам. Вось чаму ўсе партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія, калгасныя і іншыя арганізацыі павінны ўсямерна дапамагаць саветам у справе перабудовы іх работы, дапамагаць саветам стаць сапраўднымі большавіцкімі штабамі на выкананьні задач сацыялістычнага будаўніцтва, задач па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну, кіраўніцтва сацэльнай калектывізацыяй і г. д.

Партыя і ўрад ня раз падкрэсьлівалі, што на правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінны быць мабілізаваны ўсе партыйныя, камсамольскія, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі, што гэта кампанія павінна быць шчыльна ўвязана з выкананьнем усіх вузлавых задач сацыялістычнага будаўніцтва. Імкненьне правесьці перавыбары саветаў у парадку «чарговай» кампаніі зьяўляецца апартуністычнай недаацэнкай вялізарнага палітычнага значэньня перавыбараў саветаў.

Мацнее непарыўная сувязь з мільёнамі

У асноўным перавыбары саветаў праходзіліся з выстарчальнай і своячасовай падрыхтоўкай з боку грамадзкіх арганізацый на аснове шырокага ўцягненьня рабочых, калгасных, бяднацка--серадняцкіх мас і ўсіх працоўных у перавыбары. Асабліва важнае значэньне ў справе перавыбараў сельсаветаў адыграла дапамога з боку пралетараў гораду. Калі ў першы нэрыяд справаздачна - перавыбарчай кампаніі сельсаветаў некаторыя арганізацыі праявілі апартуністычную недаацэнку ўдзелу рабочых у перавыбарчай кампаніі, дык у працэсе разгортваньня перавыбараў гэта памылковая шкодная ўстаноўка была зьнішчана. У перавыбарчай кампаніі сельскіх саветаў адзначаецца значны ўдзел і ўплыў рабочых заводаў і фабрык. Гарсаветы і прафсаюзы паіравалі ў часе перавыбарчай кампаніі на вёску значную колькасьць лепшых рабочых-ударнікаў для ўзмацненьня пралетарскага кіраўніцтва перавыбарамі сельскіх саветаў.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія сельскіх саветаў зьявілася масавай палітычнай кампаніяй, якая зьяўляла перавыбары саветаў па належную палітычную вышыню і дала вялізарныя палітычныя вынікі.

Адным з важнейшых задач перавыбарчай кампаніі зьяўлялася яшчэ большая сувязь саветаў з шматмільённымі масамі выбаршчыкаў—рабочых, калгаснікаў, батрацтва і бяднякоў-сераднякоў мас вёскі. Асабліваецца перавыбараў гэтага году зьяўлялася тое, што яны адбываліся ў час, калі ў выніку найшырэйшага працэсу перабудовы дробнай вытворчасьці з заменай яе буйнымі калектыўнымі гасдаварствамі стваралася для савецкай улады на вёсцы новая вытворчая база — база буйной калектыўнай гасдаркі, калі саветы маюць для сваёй работы новы масавы актыў з ударнікаў фабрык, заводаў, калгасаў і саўгасаў.

Апіраючыся на гэты актыў і разгортваючы далей работу сярод ударнікаў і калгаснікаў, арганізуючы бедноту, саветы павінны пад кіраўніцтвам партыі забясьпечыць замацаваньне сувязі з масамі і ўцягненьне новых мільёнаў рабочых і сялян у рады актыўных будаўнікоў сацыялізму.

Расьце палітычная актыўнасьць мас

Удзел выбаршчыкаў у перавыбарчай кампаніі ў гэтым годзе значна вышэйшы, чым у мінулыя выбары. Асабліва высокая актыўнасьць была там, дзе праведзена своячасовая і выстарчальная масавая падрыхтоўка. Агульная сярэдняя актыўнасьць пры перавыбарах сельсаветаў па БССР раўняецца 66,34 проц. — павялічэньне ў параўнаньні з перавыбарамі 1929 году на 7,52 проц. Асабліва ўзрасла актыўнасьць жанчын, якая параўнальна з перавыбарамі мінулага году дае павялічэньне на 13 проц.

Цэлы рад раёнаў паказваюць актыўнасьць выбаршчыкаў вышэйшую за сярэднюю актыўнасьць па БССР. З 100 раёнаў у 36 актыўнасьць выбаршчыкаў была вышэй сярэдняй актыўнасьці па БССР. Веткаўскі, Каралінскі, Чарэйскі, Барысаўскі, Койданаўскі раёны дабіліся ў сярэднім каля 80 проц. яўкі ўсіх выбаршчыкаў.

Аднак, ёсьць і такія раёны, дзе яўка на перавыбары зьяўляецца нездавальняючай (Аршанскі, Гарадоцкі, Любаньскі, Магілеўскі).

Сярэдні процант яўкі жанчын на перавыбары параўнальна з мінулым годам павялічыўся на 13%. Але трэба адзначыць надзвычайную стракатасьць паказальнікаў аб удзеле жанчын у перавыбарах на асобных раёнах; ёсьць цэлы рад раёнаў, дзе ўдзел жанчын у перавыбарах значна вышэйшы за агульны сярэдні ўдзел выбаршчыкаў па БССР (Азарыцкі — 81,13 проц., Барысаўскі—70,20 проц., Дрыменскі — 71,81 проц.). Зусім недапушчальнае зьніжэньне яўкі жанчын на перавыбары паказваюць раёны: Аршанскі — 43,33 проц., Гарадоцкі — 40,48 проц., Копыскі — 41,17 проц., Капыльскі — 49,69 проц., Любаньскі — 40,11 проц., Стара-Дароссі—40,27 проц., Старобінскі — 37,81 проц. і г. д.

Такое зьніжэньне колькасьці выбаршчыкаў на выбарчых сходах у асобных раёнах ні ў якім разе нельга тлумачыць адсутнасьцю актыўнасьці. Факты з месц сьведчаць аб надзвычайна ўзрослай актыўнасьці працоўных гораду і вёскі. Толькі нядзольнасьць разгортваць масавую работу, права-апартуністычная недаацэнка значэньня перавыбараў і неабходнасьці арганізацыйнага ахопу гэтай актыўнасьці — зьяўляецца прычынай невыстарчальнай яўкі выбаршчыкаў на перавыбары саветаў.

Адсюль трэба зрабіць важнейшы палітычны вывад, што тыя мясцовыя арганізацыі, дзе дапушчаны прарывы на гэтым вучастку, павінны, як можна хутчэй, перабудаваць, ахапіць арганізацыйна-палітычным уплывам усе масы працоўных гораду і вёскі, накіраваць іх актыўнасьць на ўдзел у вырашэньні ўсіх задач сацыялістычнага будаўніцтва праз саветы.

Важнейшай задачай перавыбараў гэтага году было ўцягненьне ў выбарчую кампанію калгаснікаў, батрацтва і бедноты, як апоры саветаў на вёсцы. Мы павінны адзначыць, што ўдзел калгаснікаў, батрацтва і бедноты ў перавыбарах саветаў быў значна вышэйшы, чым удзел у перавыбарах іншых груп працоўнага насельніцтва вёскі. На 24 раёнах актыўнасьць калгаснікаў на выбарах у сярэднім дасягнула 77,2 проц. супроць 65,1 проц. агульнай актыўнасьці сялян; бедноты—69,8 проц. супроць 65,2 проц. актыўнасьці ўсіх сялян-аднаасобнікаў; яўка батрацтва на перавыбары вызначэцца ў сярэднім у колькасьці 77,8 проц. Аднак, рад раёнаў правялі апартуністычную недаацэнку работы сярод беднаты. Напрыклад, Пярэжырскі і Ругенскі сельсаветы, Сьмілавіцкага раёну, зусім не наладзілі ўліку бат

ТЫСЯЧЫ НОВЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ

І УДАРНАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ

—ЛЕПШЫ РАПАРТ X УСЕБЕЛАРУСКАМУ ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ.

Рашуча наступаючы на кулака, выкарчоўваючы апартунізм на практыцы, арганізаваць новую калгасную хвалю, разгарнуць сапраўды ўдарныя тэмпы падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны

Баявая падрыхтоўка да сяўбы выклікала прыліў

КОЙДАНАВА, 15. (Наш кар.). У дзень XIII гадавіны Кастрычніка ў б. фальварку Марцінавічы, Путчынскага сельсавету, арганізаваўся калгас «XIII Кастрычнік».

Сваёй узорнай работай гэты малады калгас заваяваў вялікі аўтарытэт сярод аднаасобнікаў навуковых вёсак.

Калгас па-баявому рыхтуецца да другой бальшавіцкай вясны. Арганізаваны рымарная і кавальская майстэрні, якія рамонтуюць с.-г. інвэнтар. Ссыпка і ачыстка насенных фондаў скончана. Зараз калгас заняўся расстаноўкай рабочай сілы і падрыхтоўкай яе да сяўбы.

Баявая падрыхтоўка калгасу да другой бальшавіцкай вясны, увязаная з разгортваньнем калектывізацыі, выклікала новы прыліў. На кожным калгасным сходзе аднаасобнікі падаюць заявы з просьбай прыняць іх у калгас.

11 лютага на сходзе калгаснікаў, дзе абмяркоўвалася пытаньне аб падрыхтоўцы да сяўбы, 7 аднаасобнікаў падалі заявы аб прыёме іх у калектыў.

Калгас з кожным днём расьце. Дзякуючы разгорнутай ім масавай рабоце, пашырыўся калгасны рух у вёсках Валоўнікі, Пандыкава, Юркавічы, Шышкі і радзе іншых прыгранічных вёсках.

В. Карповіч.

Арганізован калгас імя X Усебеларускага зьезду саветаў

КРУГЛАЕ, 15. (ПА ТЭЛЕГРАФУ) СКУРАТАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ, КРУГЛЯНСКАГА РАЁНУ, КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫ НА 60 ПРОЦ. ЗАРАЗ АРГАНІЗОВАН КАЛГАС ІМЯ X УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ У ВЁСЦЫ СКУРАТЫ З 37 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК, ЯКІЯ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНЫМІ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ.

КУЗЬМІН.

РАШУЧА ЎДАРЫЦЬ ПА АПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНЦЫ НАСЕННАВОДЗТВА

Заслухаўшы даклад Насеннаводкалгасцэнтру аб ходзе арганізацыі насеннаводных калгасаў, калегія Народнага Камісарыяту Зямляробства адзначыла, што раённыя арганізацыі да гэтага часу яшчэ недаацэньваюць задачы разьвіцьця насеннаводства. Гэта стаіць пад пагрозу зрыву выкананьне пастаўленых задач у галіне разьвіцьця насеннаводства ў рэспубліцы і вабесьпячэньня насеньнем сельскай гаспадаркі БССР.

З боку райкалгассаюзаў і райза Лепельскага, Ветрыўскага, Церахаўскага, Рэчыцкага, Смалявіцкага, Буда-Кашалёўскага і Мазырскага раёнаў праяўлена апартуністычная недаацэнка ў справе адбору насеннаводных калгасаў і разьмяшчэньня плошчы на вытворстве пратэатгнсвага і палепшанага насеньня.

Калегія НКЗБ пастанавіла прасіць РВК прыцягнуць да адказнасьці работнікаў райкалгассаюзаў і райза, винаватых у зрыве гэтых мерапрыемстваў.

Прапанаваць райза ў 5-дзённы тэрмін скончыць дадатковы адбор насеннаводных калгасаў. Разам з гэтым спыніць зьмяньненьне вызначаных плошчаў, а дзе яны зьмешаны—безадкладна адмяніць.

Праз 2 дэкады заслухаць даклад Насеннаводкалгасцэнтру аб выкананьні гэтага пункту.

Сэктару кадраў НКЗБ запрапанавана ў дэкадны тэрмін паслаць для работы ў Насенсаюз спэцыяліста па тэхнічных і збожжавых культурах, а таксама адкамандыраваць для работы ў гнёздавых аб'яднаньнях 26 агранамаў, скончыўшых курсы апрабацыі і лугавога насеннаводства.

У адпаведнасьці з пастановай СНК Насеннаводкалгасцэнтру, райза і райкалгассаюзам даручаецца да 1-ІІ-1931 г. арганізаваць ва ўсіх раёнах, дзе спэцыялізаваны групы калгасаў па насеннаводстве, гнёздавыя насеннаводныя аб'яднаньні.

Напярэдадні X Усебеларускага зьезду саветаў

Для дэлегатаў зьезду будзе наладжан рад канцэртаў і пастановак. Зьезд абслугоўваюць БДТ-2, Беларускі вандроўны тэатр і інш. калектывы.

***

23 лютага адбудзецца ўрачысты вечар дэлегатаў зьезду разам з вайсковымі часьцямі Менскага гарнізону, прысьвечаны XIII гадавіне Чырвонай армії.

***

Для абслугоўваньня дэлегатаў харчаваньнем спэцыяльна прымацоўваюцца сталоўкі МЦРК № 6 і 8.

Пленум ЦК Чырвонага крыжу БССР

З 10 па 13 лютага ў Менску адбываўся пленум ЦК Чырвонага Крыжу Беларусі з удзелам раённых работнікаў. Пленум заслухаў даклад сакратара выканкому Чырвоных Крыжаў і Паўмесяцаў СССР тав. Лезарава аб чарговых задачах Чырвонага Крыжу.

Пленум зацьвердзіў пяцігадовы план дзейнасьці Чырвонага Крыжу БССР.

У АБОЗЕ

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). АБ МЕСЯЧНІКУ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ НА ФАВРЫКАХ І ЗАВОДАХ БАРЫСАЎШЧЫНЫ РАБОЧЫЯ НІЧОГА НЯ ВЕДАЮЦЬ, НІ АДНА ФАВРЫКА ЯШЧЭ НЯ УЗЛЮЧЫЛАСЯ Ў МЕСЯЧНІК. РАЙПРАФСАВЕТАМ НІЧОГА НЯ ЗРОБЛЕНА І НАВАТ НЯ ДАНА НІЯКІХ ДЫРЭКТЫЎ ФЗК АБ УЗЛЮЧЭНЬНІ Ў МЕСЯЧНІК. ТОЛЬКІ НА ФАБРЫКАХ «ЧЫРВОНАЯ ВЯРЭЗІНА» І «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» НА ПЛЕНУМЕ ФЗК БЫЛО ПАСТАЎЛЕНА ПЫТАНЬНЕ АБ УЗЛЮЧЭНЬНІ Ў МЕСЯЧНІК. АЛЕ РАЦЫЯНАЛІЗАТАР І НАМ. ДЫРЭКТАРА ПА РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ ВЫКАНАНА ТОЛЬКІ АДНА, У ТОЙ ЧАС, ЯК УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ Ў НАЯВНАСЬЦІ.

Па 18 калгасах скарочана плошча пад тэхкультуры

ВЕТКА. Раённыя арганізацыі зьнімаюць пляны пасеўнай плошчы, галоўным чынам, па тэхнічных культурах. Райза, фармальна хаця і не паменшыў пляну Наркамзему, але зьнізіў кантрольныя лічбы па тэхнічных культурах па калгасах, навялічыўшы іх у індывідуальным сэктары. А кіраўніцтва райкалгассаюзу і плянавік агранам Кастрама наогул зрабілі злачынства. Райкалгассаюз утаіў кантрольныя лічбы калгасцэнтру, скарацілі плошчу тэхнічных культур па калгасах на 100 гэктараў і урэзаў гэтым у зман райком партыі. Тое-ж самае зрабілі аграномы Вечар і Пікуза, якія складалі вытворчыя пляны ў пасобных калгасах. Так, па калгасе імя Варашылава плян пасеву тэхкультур зменшан з 24 гэкт. да 12. Такія скарачэньні плянаў праведзены па 18 калгасах.

Ракаў.

На 53 трактары—ні аднаго трактарыста

ВЕТРЫНА. Ветрынская МТС да вясны будзе мець 60 трактароў, 53 трактары ўжо прыбылі, а трактарыстаў няма. Аднак, адміністрацыя МТС зусім не клапоціцца аб падрыхтоўцы кадраў для МТС. Дырэктыва Трактарацэнтру аб падрыхтоўцы 120 трактарыстаў і 25 паляводаў ня выконваецца. Не рэалізован плян арганізацыі ШКМ. Пытаньне аб падрыхтоўцы кадраў не абмяркоўвалася на агульных сходах прафактыву і партарганізацыі. На запытаньне чаму марудзяць з гэтай справай, старшы мэханік адказвае: «Падры рыхтуем», або «якое тваё дзела?».

Пры такой «рабоце» адміністрацыі МТС ёсьць пагроза паўтарэньня леташніх памылак, калі трактарысты падрыхтоўваліся на працягу 3-х дзён і ў выніку былі шматлікія выпадкі паломкі машыны.

Кудзелька.

Зьезд калгасаў Лоеўшчыны

ЛОЕЎ. (Наш кар.). Адкрыўся другі раённы зьезд калгасаў Лоеўшчыны. Многія дэлегацыі прыехалі на зьезд з вялікімі чырвонымі абозамі збожжа. Апрача дэлегатаў ад калгасаў, на зьезд прыбылі прадстаўнікі ад аднаасобнікаў амаль з усіх вёсак, якія заявілі: „Мы зьяўляемся прадстаўнікамі беднякоў і сераднякоў сёньня яшчэ некалгасьнікаў, але мы таксама станем на шлях сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі і будзем актыўнымі арганізатарамі калгасаў".

З рапартам аб барацьбе за прамфінплян выступіла дэлегацыя ад рабочых-шэфаў гомельскага заводу „Пралетары".

Да адкрыцьця зьезду ў раёне арганізавана новых 56 калгасаў.

М. Р.

Забясьпечыць закладку парніковых рам

Менскія прыгарадныя калгасы і саўгасы сёлета павінны запажыць 14.000 парніковых рам для вырошчваньня фіянсаў раньняй гародніны. Без выкананьня гэтага заданьня нельга будзе засеець усю вызначаную гародню плошчу.

Некаторыя калгасы прыступілі ўжо да закладкі парніковых рам. Але работа затрымліваецца з-за недахвату гною. Гарадзкія гаспадарчыя арганізацыі замест выкананьня настановы прэзыдыуму гарсавету аб дармовым водвозку гною калгасам стварылі ажыятаж у гэтай справе. Кошт возу гною дайшоў да 3 руб. Для закладкі парніковых рам не хапае таксама несматр'яду і шкла.

У гэтай справе трэба дабіцца пералому. Прыгарадныя калгасы і саўгасы павінны быць прымацаваны да пасобных гаспадарчых арганізацый, каб забясьпечыць пасеўную плошчу патрэбнай колькасьцю гною.

Мацеліца.

Залежы машын і гародняга насеньня

КЛІМАВІЧЫ, (Брыгада «Зьвязды»). Брыгада «Зьвязды» з удзелам рабочых і прадстаўнікоў камсамольскіх арганізацый выкрыла на складах райкаапсаюзу значныя залежы сельска-гаспадарчых машын і іншыя. Выяўлена 91 розная с.-г. машына і 45 камплектаў трактарных сявярак, трактарных боран, і г. д.

Частка машын і асабліва насеньне знаходзяцца ў бесгаспадарчым стаўбішчы. Некаторыя с.-г. машыны ляжаць на складах доўгі час і зусім непатрэбны ў гэтым раёне.

ГАРОДНАЕ І ІНШАЕ НАСЕНЬНЕ ЛЯЖЫЦЬ НА СКЛАДЗЕ ЯШЧЭ З МІНУЛАГА ГОДУ. Цяжка сказаць, чаму яно летась ня было скарыстана. Агульнавядома, што гародняга насеньня не хапала. Буракоў кармавых выяўлена 190 кілёграм, насеньня гуркоў—135 кілёграм, рэдзіскі—10 кілёграм, брукі—30 кілёграм, чырвоных канюшыны—332 кілёгр., белай канюшыны—141 кілёгр. і г. д.

Раённыя калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі ня ведаюць, у якім становішчы знаходзіцца інвэнтар у калгасах, і ня прымаюць мер, каб прызьсьці іх у гатоўнасьць.

ФІЛАНОВІЧ, КАНТАРОВІЧ.

Зьезд калгасаў абвясьціў сябе ўдарным па праведзеньні бальшавіцкай сяўбы

БУДА-КАШАЛЁЎ, 16. (Па тэлеграфу). 15-га лютага адкрыўся 2-гі раённы зьезд калгасаў Буда-Кашалёўшчыны.

Выбрана ўдарная брыгада па арганізацыі новых калгасаў у раёне. Зьезд абвясьціў сябе ўдарным па праведзеньні другой бальшавіцкай вясны.

У часе праведзеньня зьезду арганізаваліся новыя калгасы.

ЦІМОХАЎ.

4 НОВЫЯ КАЛГАСЫ

СІРОЦІНА. (Па тэлеграфу).

За час работы 2 зьезду калгаснікаў Сіроцінскага раёну арганізаваліся 4 калгасы, у якія ўвайшлі аднаасобнікі-беднякі і сераднякі з вёсак Барсукі, Кабак, Слабада, Мішневіцкага сельсавету, і вёскі Трухоцка, Казыжынскага сельсавету. Калгаснікі запэўнілі раённы зьезд, што яны цьвёрда будуць стаяць на ленінскім шляху.

Топчуцца на месцы

ЖЛОБІН. (Наш кар.). За апошні час тэмп падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ў Жлобінічыне аслаб. Плян засыпкі насеньня выкананы на 10 лютага на 70 проц. Замест 26.000 цэнтнэраў ачышчана 3.000. Між тым, у раёне ёсьць 40 трыераў і 50 збожжаачышчальных машын, якія змаглі б працуючыць значна большую колькасьць насеньня. Зусім ня прыступлена да ачысткі насеньня па Малявіцкім сельсавеце.

Паводле пляну, да веснавой сяўбы павінна быць сабрана 5.000 цэнтнэраў лопелу, але да збору яго яшчэ не прыступілі.

У веснавую пасеўную кампанію намечана арганізацыі прыгарадняй гаспадаркі на 1.000 гэктараў. Адведзена-ж дагэтуль толькі 546 гэктараў. Арганізуецца таксама новы саўгас на 2.000 гэктараў.

Дрэнна стаіць справа з агранамамі. Па раёне ёсьць 5 агранамаў, з якіх 3 працуюць у апараце. Наркамзем замест укамплектаваньня раёну агранамамі адклікаў да сябе 3-х агранамаў.

Процант калектывізацыі на раёне да вясны павінен быць даведзен да 30, замест цяперашніх 13 проц. Раённы зьезд саветаў канстатаваў, што раённае кіраўніцтва вельмі мала зрабіла ў гэтай галіне, дапусьціла анархічную стаўку на самацёк у справе разгортваньня калектывізацыі, што затармазіла тэмп калектывізацыі.

Дэлегаты зьезду абвясьцілі сябе ўдарнікамі на выкананьне заданьняў пасеўнай кампаніі.

Райпрафсавет накіраваў у калгасы для дапамогі ў праведзеньні веснавой сяўбы рабочыя брыгады з 30 чалавек. Чыгуначныя прафарганізацыі не паслалі ні аднаго.

Машніцкі.

Дасьледваньне сіласу

Пачынаючы з 16-ІІ, будзе праводзіцца дасьледваньне сіласаў закладкі 1930 г. па анкеце, зацьверджанай НК РСІ СССР. Для дасьледваньня НКЗ БССР вылучаны 32 раёны. НКЗБ прапануе ўсім раённым упаўнаважаным па пасеўнай кампаніі праверыць працу Райза ў галіне сіласаваньня.

Колькасьць аб'ектаў дасьледваньня на раён—2-5 сіласаў. Да кожнай гаспадаркі, вызначанай для дасьледваньня, трэба прымацаваць спэцыяліста, які разам з прадстаўнікамі грамадзкіх арганізацый (камсамолу, рабфаку, сельгасрабочых і г. д.) калгасаў і, нажадана, аднаасобнікаў праводзіць дасьледваньне сіласу.

Вынікі дасьледваньня, зьвязваючы іх з праведзеньнем веснавой кампаніі, трэба зрабіць прадметам шырокага абгаварэньня на сходах.

Дасьледваньне па сутнасьці зьяўляецца пачаткам масавага праведзеньня сіласнай кампаніі 1931 г. і мае вялікае значэньне.

БАЛЬШАВІЦКІ ШТУРМ ЗА ЛЁН

МНОГІМІ РАЁНАМІ НЕ РАСПАЧАТЫ

РАСОНСКІ, МЕЖАНСКІ, ЧАШНІЦКІ І РАД ІНШЫХ РАЁНАЎ УСЁ ЯШЧЭ ТОПЧУЦЦА НА МЕСЦЫ

ПРАВАЯ АПАРТУНІСТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА ТАРМОЗІЦЬ РАЗГОРТВАНЬНЕ ДВУДЭКАДНІКА ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ У ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ. МАЦНЕЙ НАЦІСК НА КУЛАКА, САМАЯ БЯЗЬЛІТАСНАЯ БАРАЦЬБА З ЯГО АГЕНТУРАЙ У РАЁННЫХ І НІЗАВЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

На штурм прарываў

Тэмпы ільназагатовак усё яшчэ застаюцца невыстарчальнымі. Дырэктывы партыі і ўраду нарушаюцца. Мы павінны былі выканаць да лютага 65% пляну, а выканана 26%, прычым апошнія пяцідзеньні студзеня далі нават зьніжэньне тэмпаў. На 1-га лютага мы недадалі краіне 10.000 тон ільну.

Першыя пяцідзеньні лютага не паказваюць пералому. Прычына прарыву — недаацэнка гаспадарча - палітычнага значэньня кампаніі з боку большасьці цэнтральных і мясцовых органаў, на якіх партыя і ўрад усклалі яе праведзеньне. Праваапартуністычная практыка з боку раду арганізацый пры праведзеньні гэтай кампаніі назіраецца і зараз.

Дырэктывы партыі і ўраду выразна паказваюць галоўныя мэтады і шляхі праведзеньня ільназагатовак. Першае—гэта свячасовы і рашучы націск на кулацка - заможныя гаспадаркі шляхам дачы ім цьвёрдых заданьняў і забесьпячэньня свячасовага іх выкананьня. Другое — гэта свячасовае спаганьне на кантрактацыі. Трэцяе — гэта ўзьвяцьце актыўнасьці калгаснікаў для першачарговай апрацоўкі і здачы ліцкаў ільну калгасамі. Правільнае праведзеньне гэтых мерапрыемстваў паміна было рабясьпечыць сапраўднае ўзьвяцьце актыўнасьці бядняцкіх і серадняцкіх мас у выкананьні асноўнай часткі пляну ў парадку самаабавязацельства, мабілізаваць масы, на барацьбу з кулаком.

Як мы выканалі дырэктывы партыі і ўраду? Вельмі дрэнна. На кулака пасапраўднаму не націснулі. Аб гэтым выразна гаворыць тое, што цьвёрдымі заданьнямі ахоплена ўсяго на БССР каля 3,5% гаспадарак замест 5,7%.

Колькасьць ільну на цьвёрдых заданьнях складае да 6-7% пляну пры неўпаўнай магчымасьці давесьці гэтыя лічбы да 10-15%. Па цьвёрдых заданьнях спагнана ўсяго 50-60%. Адсюль і зразумела, што ў загатоўленым ільне вельмі мала кулацка-заможнага. Кулак і заможнік прадаюць лён на рынках па досыць дарагіх цэнах.

Ня лепш са спагнаньнем па кантрактацыі. З 2.600 тон спагнана ўсяго 1.250, або 48%.

Вельмі слаба мы дапамаглі калгаснікам свячасова апрацаваць лён і здаць яго дзяржаве. Тое, што калгасы выканалі ўсяго 23% пляну, гаворыць аб тым, што калгаснікі ня былі мабілізаваны на выкананьне гэтай задачы, што апрацоўка ільну ў калгасах і здача праходзіла самацёкам.

Такая работа на трох зьвеньнях не магла забясьпечыць скарыстаньне чацьвертага зьвяна — узьняцьця актыўнасьці бядняцка - серадняцкіх мас у выкананьні пляну ў парадку самаабавязацельства. Мы ня здолелі таксама правільна скарыстаць нашы таварныя фонды для стымуляваньня хуткай здачы ільну бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі.

Мы павінны ўзмоцненай масавай работай у лютым даць прамысловасьці недаданы ранейшы лён. Трэба практычна ўзяцца за праверку выкананьня дырэктыў партыі і па-бальшавіцку забясьпечыць іх выкананьне.

Люты зьяўляецца апошнім месяцам зімовых загатовак. Кожная гадзіна дарагая. Усе сілы трэба кінуць на ільназагатоўкі, на штурм прарываў.

АБРАМСОН.

Скасаваньне прэміяваньня Кругляншчыны

3-га лютага праўленьне Белільнасаюзу пастанавіла выдаць прэмію Круглянскаму райкаапсаюзу за пасьпяховае праведзеньне ільназагатовак. 12-га лютага праўленьне пастанавіла скасаваць выдачу прэмій Круглянскаму раёну. Прычына скасаваньня наступная. У працэсе загатовак ільнавалакна па Круглянскім раёне адсутнічаў клясавы подыход, ня было належнага націску на кулацка-заможную частку вёскі. У выніку — па групе кулацка-заможных гаспадарак загатоўлена вельмі нязначная колькасьць ільнавалакна.

Кулака не чапаюць

ЛЕПЕЛЬ. (Па тэлефону). У КАМЕНСКІМ сельсавеце, Лепельскага раёну, плян загатовак ільну па сельсавеце выкананы усяго толькі на 16%. Такія вынікі выразнай праваапартуністычнай практыкі Каменскага сельсавету і парт'ячэйкі. ЦЬВЁРДЫЯ ЗАДАНЬНІ НЕ ДАВЕДЗЕНЫ ДА ЎСІХ КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫХ ДВАРОЎ. НІЯКІХ МЕР СПАГНАНЬНЯ ДА 16 КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫХ ГАСПАДАРАК, ЯКІЯ НЯ ВЫКАНАЛІ СВАІХ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ, НЯ ЎЖЫВАЕЦЦА.

Члены сельсавету ня ведаюць заданьняў па загатоўках ільну па іх вучастках.

ПРА АДОЗВУ ЦК УсеКП(б) І СНК АБ КАНТРАКТАЦЫІ ПАРТ'ЯЧЭЙКА І СЕЛЬСАВЕТ НЯ ВЕДАЮЦЬ. ТОЛЬКІ ЗАРАЗ ПАЧАЛІ ШУКАЦЬ ГАЗЭТЫ, ДЗЕ НАДРУКАВАНА АДОЗВА ЦК. РАБОТА З БЕДНАТОЙ АДСУТНІЧАЕ.

Пленум сельсавету і сход парт'ячэйкі, што адбыліся за апошнія дні, пастанавілі прыняць рад практычных прапаноў да ўзмацненьня загатовак ільну і рэалізацыі адозвы ЦК аб кантрактацыі.

РК КП(б)Б трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на парткіраўніцтва сельсавету і ачысьціць яго ад правых апартуністаў.

Брыгада «Зьвязды»—

РАДЗЮК, МАРЧУК.

Калгасьніцы „Авангарда" арганізуюць

брыгады штурму за лён імя X Усебеларускага зьезду саветаў

ЛЕПЕЛЬ. (Па тэлеграфу). Удзельнікі сходу жанчын-калгасьніц калгасу «Авангард», заслухаўшы даклад брыгады «Зьвязды» аб штурме за лён, абвясьцілі сябе мабілізаванымі на ўзмацненьне загатовак ільну.

Пастаноўлена арганізаваць брыгады штурму за лён імя Ўсебеларускага зьезду саветаў. Задача брыгад—ліквідаваць прарывы на фронце ільназагатовак.

Сход выклікае пасьледваць гэтаму прыкладу іншыя калгасы.

Ільнаводчая каапэрацыя пералому не дала

У ходзе загатовак ільнавалакна і пянькі за другую пяцідзеньку лютага месяца па лініі ільнакапляводчай каапэрацыі фактычна ніякага пералому не дасягнута. Другая пяцідзенька лютага, параўнальна з першай, дае павялічэньне толькі на 4,5 тоны. Вынікі яўна недавальняючыя—гадавы плян выкананы усяго на 28,9 проц.

Выкананьне пляну ў разрэзе паасобных вядучых сыстэм надзвычай рознастайнае. Так, раёны ільнаводчай каапэрацыі выканалі гадавы плян на 37,4 проц., садова-гароднінай—на 19,1 проц., а жывёлагадоўчай— на 13,1 проц.

З раёнаў малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі першае месца займае Вузьдзенскі раён, выканаўшы гадавы плян на 82,3 проц. Усе іншыя раёны жывёлагадоўчай каапэрацыі выканалі ніжэй 30 проц. у той час, як многія з іх працуюць у аднолькавых умовах і пры аднолькавым ляніе з Вузьдзенскім раёнам.

Ганебна адстаючымі раёнамі ільнаводчай каапэрацыі зьяўляюцца: Ветрынскі, які выканаў свой гадавы плян на 3,8 проц., Горацкі—на 10,4 проц., Кармянскі—на 10,8 проц.; в садова-гародніх раёнаў: Гомельскі—на 5,8 проц.; з жывёлагадоўчых раёнаў: Чырвона-Слабодзкі—0,6 проц., Самахвалавіцкі—0,6 проц., Лепельскі—1 проц., Юравіцкі—1 проц. і рад іншых.

Загатоўка пянькі праходзіць яшчэ горш—плян па сельска-гаспадарчай каапэрацыі выкананы усяго на 4,7 проц.

Загатоўка пянькі праходзіць яшчэ горш—плян па сельска-гаспадарчай каапэрацыі выкананы усяго на 4,7 проц.

Збор кантрактаванага ільна-валакна праходзіць па-ранейшаму надзвычай дрэнна. Побач з раёнамі, якія сабралі кантрактаваны лён у індывідуальным сэктары ад 50 да 100 проц. (Лёзьна, Гарадок, Крупкі), ёсьць раёны, у якіх зусім адсутнічае гэты ўлік. Гэта, галоўным чынам, у раёнах малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі, а таксама з ільнаводных раёнаў: у Бешанковічах, Боркавічах, Лепелі і Шклове. Горацкі раён сабраў кантрактаванага ільну ў індывідуальным сэктары толькі 9,6 проц., Дубровенскі—6,4 проц., Любаньскі—7,2 проц.

Толькі недаацэнкай важнасьці ільназагатовак і правым апартунізмам на практыцы можна тлумачыць той факт, што рад раёнаў пры аднолькавых умовах выканалі плянавае заданьне з разьбежкай ад 40 да 60 проц.

Зусім недапушчальнае становішча па дачы цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам вёскі і зборы прадукцыі на гэтых заданьнях. Так, Лядзянскі райкаапсаюз наведамляе 16 лютага, што кулацка-заможным гаспадаркам даны цьвёрдыя заданьні—194 цэнтнэры, а сабрана ўсяго 64 цэнтн., Ветрынскі райкаапсаюз наведамляе, што цьвёрдыя заданьні даны 73 кулацка-заможным гаспадаркам на 160 цэнт., з колькі сабрана—уліку няма.

Некаторыя раёны толькі ў студзені месяцы пачалі даводзіць пляны на ільне да кулацкага двара, як гэта мела месца ў Вушэцкім раёне. Гэта гаворыць аб тым, што асноўная прычына ганебнага пералому плянаў ільназагатовак у цэлым радзе раёнаў заключаецца ў тым, што кулацка-заможныя гаспадаркі выпушчаны былі з-пад увагі раённых кіруючых, рэгулюючых і загатоўчых арганізацый, што зьяўляецца найгоршым відам апартунізму на практыцы. Нават у такіх раёнах, як Круглянскі, дзе плян ільназагатовак параўнальна з другімі раёнамі выкананы больш-менш здавальняюча (66,6 проц.), цьвёрдыя заданьні даны толькі з проц. гаспадарак.

Другой прычынай слабога ходу загатовак зьяўляецца дрэнны збор кантрактаванай прадукцыі. У цэлым радзе раёнаў злостныя няздатчыкі кантрактаванай прадукцыі ня прыцягнуты да адказнасьці.

Нездавальняюча праходзіць здача прадукцыі ільну калгасамі, плян імі выкананы на 10 лютага ўсяго на 27 проц.

Двухдэкаднік штурму ільназагатовак павінен быць выкарыстан для рашучага ўзмацненьня загатовак ільну. Да канца двухдэкадніка плян ільназагатовак у іншым павінен быць выкананы.

Двухдэкаднік штурму дапаможа выпрацаваць прарывы пры ўмове актыўнага ўдзелу ўсёй партыйнай і савецкай грамадзкасьці і пры ўдарных тэмпах работы загатоўчых арганізацый.

Сацыялістычная прамысловасьць павінна атрымаць патрэбны сырэц.

ЛАЦІС.

Лён прадаецца на вольным рынку

ЗАСЛАЎЕ. (Наш кар.). Ільназагатоўкі па Заслаўскім раёне праходзяць вельмі дрэнна. Плян выкананы усяго на 22 проц. Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнымі гаспадаркамі выкананы толькі на 37 проц., ня гледзячы на тое, што ўсе тэрміны прайшлі.

Гэта вынік праўленьня правага апартунізму на практыцы, неправядзеньня выразнай клясавай палітыкі пры загатоўках, адсутнасьці належнага націску на кулака, каб прымусіць яго свячасова выканаць даныя яму заданьні.

Масавая работа адсутнічае. Загатоўчыя арганізацыі не пераключыліся на ўзмацненьне загатовак. Лён прадаецца на вольным рынку, а загатоўчыкі чакаюць, пакуль лён самацёкам прыдзе ў іх склады.

Свой.

Лепшыя раёны прэміяваны

За лепшае выкананьне загатовак як ільну, так і іншых відаў сырцу і збожжа цацьвёрка ЦК і СНК пастанавіла прэміяваць наступныя раёны: ЛЕГКАВЫМІ МАШЫНАМІ — Лёзьненскі і Дрысенскі; ГРУЗАВЫМІ МАШЫНАМІ —Вузьдзенскі, Межынскі, і Высачанскі. Апрача таго яны прэміяваны і прамтаварамі: Лёзьненскі і Дрысенскі—на 10 тыс. руб., Вузьдзенскі, Межынскі і Высачанскі—на 5 тыс. рублёў.

47 клгр.!

ЧАШНІКІ, 14. (Па тэлеграфу). Заданьне па загатоўках ільну на Чашніцкім раёне выкананa усяго на 40 проц. За апошнюю пяцідзеньку калгасы здалі 1.424 кгр. ільну, а аднаасобнікі—толькі 47 кгр.

Пост «Зьвязды»—СТЭРНІН.

Расоны—18 проц.!

РАСОНЫ. (Па тэлеграфу). План загатовак ільнавалакна раён на 10 лютага выканаў на 18%, ільнянога семя — 35%.

Цьвёрдыя заданьні на 30 вёсках даны 468 кулацка-заможным гаспадаркам, або 5½%. Заданьні кулацка-заможнымі гаспадаркамі на 25 студзеня выкананы на ільнавалакне на 63%, на ільняным семі — на 57%. Узяты меры да поўнага выкананьня заданьня на працягу лютага.

Райком партыі ТУРЫМ.

У Межыншчыне давялі цьвёрдыя заданьні да... серадняку

МЕЖЫНА. (Наш кар.).

Апошняя дзесяцідзенька не дала рашучага зруху ў выкананьні пляну загатовак ільну па Межынскім раёне. Апошняя дэкада дала павялічэньне выкананьня пляну толькі на 5 проц., усяго на 10-га лютага плян выкананы на 41,12 проц.

На першым месцы па выкананьні пляну ідзе Вышацкі сельсавет, які выканаў 61 проц. заданьня, Руднянскі—54 проц. і Межынскі—53 проц. Рэшта сельсаветаў свае заданьні выканалі толькі на 20-30 проц. Ганебна адстае Вярэцкі сельсавет, які выканаў 6,9 проц. заданьня.

Галоўнай прычынай слабога ходу ільназагатовак зьяўляецца тое, што раённыя арганізацыі не перабудавалі сваёй работы, не павярнуліся тварам да ільназагатовак.

Да гэтага часу не праведзена выкананьне самаабавязацельстваў на ільназагатоўках. Да кулацка-заможных гаспадарак цьвёрдыя заданьні поўнасьцю не даведзены. Кулацка-заможныя гаспадаркі на сёньняшні дзень выканалі толькі 5,11 проц. агульнага пляну. Меры спагнаньня да кулацка-заможных гаспадарак, якія ня выканалі цьвёрдых заданьняў, ня ўжываюцца.

Ёсьць выпадкі, калі цьвёрдыя заданьні даводзіліся да серадняцкіх гаспадарак і паадварот, калі кулацка-заможныя гаспадаркі атрымлівалі вельмі малыя заданьні.

У Газьбінскім сельсавеце кулаком былі даны цьвёрдыя заданьні з разьліку 9 пудоў на гэктар, замест патрэбных 14. У Полаўскім сельсавеце заданьні даводзіліся да серадняцкіх гаспадарак і навет з цьвёрдага разьліку на 12 пудоў за кожны поўгэктар.

Загатоўчыя арганізацыі зусім дрэнна працуюць. Загатоўчыя арганізацыі чакаюць, пакуль сялянне самі здадуць лён на пункце, не займаючыся загатоўкай непасрэдна ў вёсцы.

10-га лютага адбылося пашыранае пасяджэньне райвыканкому сумесна з брыгадай ЦКК-РСІ на якім прынята рад практычных мерапрыемстваў па ўзмацненьні ільназагатовак.

Арганізавана 9 брыгад з партыйнага і прафэсыянальнага актыву, якія выехалі на вёску для ліквідацыі прарываў на ільназагатоўках.

Аркадзь Зарубежны.

Парткалектыў—штаб змаганьня за прамфінплян

Парткалектыў «ПАЛЕСДРУКУ» (Гомель) здолеў перабудаць сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду, у адпаведнасьці з задачамі паваротку тварам да вытворчасьці. Толькі дзякуючы таму, што партарганізацыя ўсю сваю работу падпарадкавала задачам змаганьня за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, рабочы калектыў «Палесдруку» піквідаваў прарывы ў прамфінпляне за першы і другі квартал мінулага гаспадарчага году і другі год пяцігодкі скончыў з вялізарнымі посьпехамі па выкананьні прамфінпляну. Пачынаючы з САКАВІКА і КАНЧАЮЧЫ ВЕРАСЬНЕМ, ПРАМФІНПЛЯН ВЫКОНВАЎСЯ Ў РАЗЬМЕРАХ АД 125 ДА 142.

У жніўні месяцы прадпрыемства перайшло не 7-гадзінны працоўны дзень. Апартуністы і маляверы зацьвярджалі што ў сувязі з пераходам на 7-гадзінны працоўны дзень зьнізіцца прадукцыйнасьць працы, зарплата, павялічыцца брак і наогул прадпрыемства будзе працаваць горш, чым пры 8-гадзінным працоўным дні. У першы месяц ПАСЬЛЯ ПЕРАХОДУ ПРАДПРЫЕМСТВА НА 7-ГАДЗІННЫ ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ ПРАМ ФІНПЛЯН БЫЎ ВЫКАНАН НА 135 ПРОЦ., ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА УЗРАСЛА НА 2,7 ПРОЦ., УЗРАСЛА ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ НА 9 ПРОЦ., ДАСЯГНУТА ЗНАЧНАЕ ЗЬНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ. Гэтыя лічбы выразна гавораць аб тым, што пераход на 7-гадзінны працоўны дзень на толькі не пагоршыў работы прадпрыемства, а выклікаў новы ўздым актыўнасьці рабочых, павялічэньне прадукцыйнасьці працы і палажыў пачатак упартаму змаганьню рабочага калектыву за перавыкананьне прамфінпляну па ўсіх паказальніках.

Прамфінплян за мінулы гаспадарчы год «Палесдрукам» выкананы на працягу 11 месяцаў.

Верасьнёўская АДОЗВА ЦК УсеКП(б) ЗНАЙШЛА ШЫРОКІ ВОДГУК З БОКУ

ЗЬНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ—

НА РЭЙКАХ АПАРТУНІСТЫЧНАГА САМАЦЁКУ

Калькуляцыі—са столі, эканомія—за кошт якасьці, „аб'ектыўныя прычыны"—замест плянавай работы

УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ, РАБКОРЫ, „ТРЫКУТНІКІ"—НА БАРАЦЬБУ ЗА ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ЗЬНІЖЭНЬНЯ САБЕКОШТУ

ПРОЦАНТ ЗЬНІЖЭНЬНЯ—ВЫСМАКТАЛІ З ПАЛЬЦА

У Гомелі ёсьць два лесазаводы—«Сацыялізм» і «Калектыўная праца». Прадпрыемствы зусім аднародныя, прычым завод «Калектыўная праца» паваг лепш абсталяваны (пазоўнасьць гофманскіх варштатаў). Цікава будзе параўнаць, як гэтыя два заводы зьніжаюць сабекошт прадукцыі?

Завод «Сацыялізм» меў заданьне зьнізіць сабекошт за 1929-30 г. на 10 проц. Ён перавыканаў гэта заданьне, зьнізіўшы сабекошт на 12 проц. Аналіз калькуляцыі паказвае, што зьніжэньне сабекошту дасягнута за кошт **паляпшэньня большасьці гапін работы заводу.** Напрыклад, унутрызаводзкія выдаткі на працэсы ад падачы сырцу да ўкладкі дошак паменшаны з 2 руб. 87 кап. да 2 руб. 64 кап., **дзякуючы ўшчыльненьню рабочага дня і добраахвотнаму зьніжэньню расцэнак,** што дало 12.200 руб. эканоміі. Выдатак рабочай сілы на рама-зьмену складае 17 чалавека-дзён замест плянавых 21 чалавека-дня. **Значны эканамічны эфэкт далі рацыяналізатарскія мерапрыемствы.** Агульназаводзкія выдаткі зьніжаны на 6 проц., пры гледзячы на павялічэньне самога каштарысу за кошт дадатковага міліцэйскага паста, узмацненьня пажарнай аховы, на што выдаткавана 3 тыс. руб. Прадукцыйнасьць рама-зьмены па расьлёўцы павялічана на 2 проц. у параўнаньні з плянавым заданьнем, а на выпуску прадукцыі — на 4,71 проц. Прадукцыйнасьць працы на аднаго рабочага павялічана на 23 проц. пры павялічэньні зарплаты на 8 проц. Выпуск прадукцыі складае 61,019 кубамэтраў піламатар'яніў замест 59.143 кубамэтраў. Павялічэньне выпуску прадукцыі таксама адбілася на сабекошце, зьнізіўшы яго да 24 руб. 20 кап. кубамэтр гатовай прадукцыі замест 25 руб. 44 кап.

Паглядзім, як працаваў завод «Калектыўная праца». Ня гледзячы на лепшыя ўмовы работы, завод «Калектыўная праца» на працягу 1929-30 г. здаваў адну пазыцыю за другой. Па-першае завод ня выканаў праграмы на 53 рама-зьмены, што зьменшыла праграму на 11.600 руб. і гэта, ня гледзячы на тое, што замест 14 рабочых на рама-зьмену паводле пляну, працавала 16. Па-другое, выпрацоўка на аднаго рабочага меншая плянаванага заданьня на 9 проц., а заданьне па прадукцыйнасьці працы ня выканана на 0,62 проц. у той час, як зарплата вырасла на 4 проц. Валавы кошт дрэваапрацоўкі складае 4 руб. 69 кап. замест 4 р. 48 кап. Цэхавыя выдаткі павялічаны на 17 проц., агульназаводзкія—на 22 проц.

Характэрна, што перарэзка аднаго кубамэтра сырцу каштавала даражэй на 7 кап., чым на заводзе «Сацыялізм». Сабекошт сырцу прадугледжан плянам у 24 руб. 11 кап., фактычна кубамэтр сырцу каштаваў 25 руб. 47 кап. Нізкая гатунковасьць прадукцыі прынесла каля 4 тыс. рублёў страты.

Прагулы складаюць 5,87 проц. рабочага часу ў той час, як на заводзе «Сацыялізм» складаюць толькі 0,36 проц.

Усё гэта спрыяла таму, што заданьне па зьніжэньні сабекошту выканана замест 13 проц. толькі на 8 проц.

Чым-жа тлумачаць кіраўнікі заводу «Калектыўная праца» такое ганебнае становішча са зьніжэньнем сабекошту? «Ведаеце — кажа адміністратар,—мы больш увагі зварачалі на колькасныя паказальнікі. Нам здавалася, што гэта больш важна, са зьніжэньнем сабекошту можна пачакаць».

Таксама адміністрацыя спасылаецца на „аб'ектыўныя прычыны": неадсартаваны лес, перабої з забесьпячэньнем, прастой і г. д. Зразумела, гэтыя спасылкі ня вытрымліваюць крытыкі. Ніхто-ж ня скажа, што кіраўнікі заводу **вельмі рэдка аналізавалі калькуляцыю, не давялі якасных паказальнікаў да рабочых,** ня імкнуліся да таго, каб **пікідаваць 4-5-месячныя спазьненьні ў справе складаньня калькуляцыі, не інфармавалі рабочых аб ходзе зьніжэньня сабекошту.** Наадварот, дырэктар і бухгальтэрыя імкнуліся замазаць агіднае становішча на прадпрыемстве. Напрыклад, лішні выдатак на кантору ў суме 4 тыс. руб. аднесен не за кошт вытворчасьці, а за кошт гандлёвых выдаткаў.

Прараў у зьніжэньні сабекошту **не ўзварушыў «трыкутніка» заводу.** Лічбы аб асобных квартал паказваюць яшчэ горшы малюнак. З моманту аб'яднаньня гэтых двох лесазаводаў, заводакіраўніцтва амаль што не зварачае ўвагі на завод «Сацыялізм». У выніку па заводзе «Сацыялізм» яшчэ няма калькуляцыі за асобны квартал. Якасныя паказальнікі да рабочых не даведзены. Праграма выпуску прадукцыі выканана толькі на 83 проц. Кепская арганізацыя працы, незацікаўленасьць тэхнічнага персаналу прывяла да 290 рама-гадзін прастою. Выхад прадукцыі ад кубамэтра сырцу складае 65 проц. замест плянавых 68. Прадукцыйнасьць працы павялічана толькі на 50 проц. заданьня, затое зарплата павялічана звыш заданьня на 4 процанты. Замест 9 чалавек на рама-зьмену працавала 18 чал.

Пачынаючы трэці год пяцігодкі, заводакіраўніцтва ўстанавіла заданьне па зьніжэньні сабекошту для заводу «Калектыўная праца» на 4,78 проц. Адкуль узялася гэта лічба—нікому невядома, **бо вывучэньне вытворчых магчымасьцяй заводу прайшло міма адміністрацыі.** Яшчэ горшая справа на заводзе «Сацыялізм». **Завод ня мае заданьня па зьніжэньні сабекошту.** Адміністрацыя тлумачыць гэта тым, што калькуляцыя 1929-30 г. скончана з вялікім спазьненьнем, таму ня было магчымасьці скласьці новай заданьні.

Такое становішча недапушчальна. КК-РСІ павінна выяўляць вінаватых у такой кепскай пастаноўцы работы і прыцягнуць іх да адказнасьці.

МАЛАСТОЎКЕР.

Бухгальтэрыя не сьпяшаецца

Сабекошт прадукцыі мебіі за ўеб цікавіць адміністрацыю паперовай фабрыкі «Спартак» (Шклоў). Калькуляцыя на фабрыцы пастаўлена вельмі кепска. Кепска ў тым сэнсе, што сваім позьнім зьяўленьнем у сьвет яна не дае магчымасьці адразу прадугледзець адмоўныя моманты работы прадпрыемства на далейшае.

Дый сваячасовае складаньне калькуляцыі не дало-б належнага эфэкту, бо аналізу калькуляцыя ня робіць. **Няма чалавека.** А без аналізу калькуляцыя—нуль. Дасылаюцца калькуляцыі для аналізу ў паперабіднаньне, **але адтуль ніколі ніякіх указаньняў няма.**

Фабрыка да гэтага часу ня ведае, за кошт чаго яна мела зьніжэньне сабекошту ў 1929-30 г.

Ня ведае фабрыка і аб прычынах **павялічэньня сабекошту** за першыя два месяцы асобнага кварталу, а таксама аб тым, з якімі паказальнікамі па зьніжэньні сабекошту яна скончыла асобны квартал, бо ня толькі за асобны квартал, а нават, **за сьнежань** калькуляцыя яшчэ ня складзена.

Сваячасовасьці складаньню калькуляцыі перашкаджае ня досыць выразная работа бухгальтэрыі і адсутнасьць калькулятара. Бухгальтэрыя позьніцца са складаньнем неабходных для калькуляцыі вестак. Сярод работнікаў бухгальтэрыі няма дагаворанасьці, ініцыятывы і зацікаўленасьці работай.

БАД.

У Гомелі—прарыў

Па большасьці прадпрыемстваў весткі, якія ёсьць толькі за кастрычнік, прымушаюць біць трывогу: **сабекошт зьніжаў на 2,7 проц. замест 11,2 проц.**

Ускрыць сапраўдныя прычыны гэтага ганебнага прарыву — ня зусім лёгкая справа. Самі гаспадарнікі ня могуць даць на гэта пытаньне больш-менш здавальняючы адказ. Калькуляцыя, якая **адстае на тры месяцы,** не дае магчымасьці вывяўць, якія элементы пляну зьніжэньня сабекошту выканаены. Прычым зусім магчыма, што нават тыя прадпрыемствы, якія «наогул» выканалі плян зьніжэньня сабекошту, зрабілі гэта не за кошт разгортваньня рацыяналізацыі, не за кошт правільнага скарыстаньня абсталяваньня, не за кошт ушчыльненьня рабочага дня, а за кошт **пагоршаньня якасьці прадукцыі.** Напрыклад, **Гомельская цукеркавая фабрыка** зьнізіла ў 1929-30 г. сабекошт на 13 проц. замест 10. Мы пытаемся ў кіраўнікоў фабрыкі — «дазвольце даведацца, як вам гэта ўдалося, каб ваш воцыт перанесьці на іншыя прадпрыемствы». Выразнага адказу мы не атрымалі, але пра сёе-тое даведаліся самі. Аказваецца, на 4,5 проц. сабекошт зьніжан **за кошт эканоміі на поўфабрыкаце.** Гэта значыць — **пагоршылі якасьць цукерак,** на даўны патрэбнай колькасьці лімонная кіслата, малака і г. д.

Ня менш даўнім зьяўленьцем становішча са зьніжэньнем сабекошту на фабрыцы **«Камінтэрн».** Як вядома, фабрыка амаль выканала заданьне па зьніжэньні сабекошту. За кошт чаго? Можа за кошт ушчыльненьня рабочага дня і ўзмацненьня працэсы? Не, аказваецца, фабрыка за 1929-30 г. мела 26.813 прагульных дзён, на чым яна страціла 5.760 р. Можа за кошт рацыянальнага скарыстаньня абсталяваньня? Не, тэхнічныя прастой складаюць 11.143 рабочых гадзіны, якія абышліся фабрыцы 6.160 руб. Можа за кошт увагі ў рабоце цэхаў? Таксама не, бо на складзе, напрыклад, ляжыць на 10 тыс. р. гатовых майтак, якія чакаюць піджакоў. Наасобныя нязгодзі каштавалі фабрыцы 1.500 руб., пераробкі — звыш 3 тыс. руб. Усяго фабрыка страціла па розным непрадукцыйным выдаткі **больш за 16 тыс. руб.** Аднак, яна выканала заданьне па зьніжэньні сабекошту. Бясспрачна, што і тут ня ўсё добра: або пагоршылася якасьць **(такіх фактаў шмат),** або плян зьніжэньня сабекошту складзен **не рэальна.**

Калькуляцыя на гэтай-жа фабрыцы за кастрычнік таксама паказвае неадзавальняючыя вынікі: сабекошт зьніжан усяго на 4,7 проц. Гэта атрымалася таму, што плян зьніжэньня сабекошту на асобны квартал складзен **наугад,** што ня былі ўдасканалены тыя элементы, якія павінны легчы ў аснову зьніжэньня сабекошту. Такім чынам, **зараз ніхто ня ведае знайсьці, па якіх прычынах плян ня выкананы,** з тым, каб вакол гэтых прычын мабілізаваць актыўнасьць усяго калектыву.

Мы гэтыя факты прывялі для таго, каб паказаць, як кепска адбіваецца на зьніжэньні сабекошту калькуляцыя, якая **спазьняецца на 2-3 месяцы.** Гаспадарнікі примушаны працаваць усьлепую, бо ня маюць магчымасьці сваячасова ўлічваць тыя зьмены, якія могуць быць за паўны нэрыад у сабекошце сырцу, зарплаце і г. д.

Таму кампанію за зьніжэньне сабекошту трэба пачаць абавязкова з таго, каб **рашучэй падцягнуць работу нашых калькулятараў.** Мэтадамі іх работы павінны стаць ударництва і сацпаборніцтва.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на разгортваньне рацыяналізацыі, як галўнай крыніцы зьніжэньня сабекошту, на увязку паміж цэхамі і іх плянавую работу.

Вось характэрны прыклад, колькі каштуе ніплянавая работа. Завод **«Пралетарыі»** атрымаў заказ на пекальні сцень дэталяй. Пры плянавай работе заказ можна было выканаць **за тры месяцы і за 2 тыс. руб.,** але, з прычыны **няўзвязкі работы цэхаў,** выкананьне заказу цягнулася **паўтара года і каштавала 5 тыс. рублёў.**

Трэба, нарэшце, дабіцца давядзеньня пляну зьніжэньня сабекошту **да кожнага варштату, да кожнага рабочага.** Рабочы павінен ведаць ня толькі пра тое, колькі каштуе фабрыцы пара ботаў або гарнітур. Ён павінен ведаць, колькі каштуе **яго працэс работы** і колькі павінен быць зьніжан сабекошт на гэтым працэсе. Толькі тады рабочая маса знойдзе шлях для зьніжэньня сабекошту, якія дадуць магчымасьць на толькі выканаць, але і перавыканаць плянавыя заданьні.

Трэба, каб пляны зьніжэньня сабекошту складаліся на толькі ў габінэтах, трэба **каб прафарганізаваць мабілізавалі масу на складаньне сустрэчных плянаў зьніжэньня сабекошту.** Калі якасныя паказальнікі па зьніжэньні сабекошту будуць вядомы кожнаму рабочаму, гэта дапамога сваячасова вывяўць вузкія месцы і мабілізаваць масы на ліквідацыю прарываў.

Б. ЗЭЛЬМАНАЎ.

ІНСТРУКТАРА БЕЛСЕЛЬТРЭСТУ ЛІСОЎСКАГА-ДА АДКАЗНАСЬЦІ

На працяту 4-х год у саўгасе імя Войкава (Кармянскі раён) на бровары працаваў у якасьці броварніка тав. Казакевіч. Тав. Казакевіч праявіў сябе, як добры адміністратар і актывіст, прымаў актыўны дзел у грамадзкай працы. Але карыснай рабоце тав. Казакевіча на бровары паважыў канец інструктар Белсельтрэсту Лісоўскі, які прыехаў «для агляду гаспадарчага стану саўгасу».

Лісоўскі імкнуўся прыстроіць намесьнікам броварніка свайго чалавека — **Клубовіча,** для гэтага Лісоўскі патрабуе зьняцьця вылучэнца Чыркевіча і прызначэньня на яго месца Клубовіча.

Не атрымаўшы згоды ад Казакевіча, Лісоўскі замест высьвятленьня гаспадарчага стану саўгасу, пачаў шукаць сродкаў, каб скампрамэтаваць Казакевіча.

Праз некалькі дзён Лісоўскі складае акт пад назвай «шкодніцтва на заводзе імя Войкава», у якім зусім неўгрунтавана абвінавачвае Казакевіча ў шкодніцтве і інш.

Казакевіча арыштавалі і праз некаторы час адбыўся суд. Зразумела, што абвінавачаньні, высунутыя ў акце, не пацьвердзіліся. **Казакевіч быў апраўданы.**

Але Лісоўскі на гэтым не супакоіўся. Ён дабіўся таго, каб Казакевіч быў перакінут на іншы завод.

Скарні Казакевіча ў Белсельтрэст не знаходзяць адпаведнага рэатаваньня. У выніку зьмены майстра і прызначэньня неадпаведнага гэтай пасадзе намесьніка, былі сарваны 53 заторы і сапсаваны 80 пудоў ячменю. Прадукцыйнасьць працы на заводзе зьнізілася, заданьне заводу, якое раней выконвалася за 20 гадзін, зараз выконваецца праз 24 гадзіны. Новы броварнік з работай не спраўляецца, а яго намесьнік Клубовіч на заўвагі рабочых адказвае: «Вы дурні, і ня ваша справа лезьці туды, куды ня трэба».

Паданых фактаў даволі, каб упэўніцца, што сапраўдным шкоднікам зьяўляецца не Казакевіч, а Лісоўскі.

Між тым, злачынная дзейнасьць Лісоўскага не спаткала належнага адпору з боку кіраўніцтва саўгасу.

Парт'ячэйка і групком таксама ня ўжылі мер для спыненьня агіднай дзейнасьці Лісоўскага.

Кармянская райКК-РСІ толькі канставала, што пераклёпка Казакевіча зьяўляецца няправільнай, а таксама і адзначыла моманты бестасцадарчасьці, **але не зрабіла належных выводаў у адносінах да кіраўніцтва саўгасу.**

Справай Лісоўскага і тых, хто яму патурае, павінна неадкладна заняцца пра куратура.

Н.

Нам пішуць

Культработа—у заняпадзе

Культурна-асьветная работа сярод рабочых і працоўных м. Тапачына не вядзецца.

У нардоме холадна і цёмна. Апрача сходаў і кіно-сэансаў, у ім нічога не праводзіцца. Прафсаюзныя клюбы гарбароў і пажарнікаў бязьдзейнічаюць.

Мостачковы.

Даць электрычнасьць

За 200 мэтраў ад ст. **Жыткавічы** знаходзіцца завод-камбінат, які дае электрычнасьць станцыі. Але, на жаль, электрычнасьць праведзена толькі ў памяшканьнях ваапэрацыі і саюзтрансу. У памяшканьнях-жа, дзе працуюць чыгуначнікі, па-ранейшаму концыцца газавыя лямпы.

Пытаньне ўжо ставілася перад мясцовымі арганізацыямі, аднак, ніякіх вынікаў яшчэ ня відаць.

Чыгуначнік.

Тавары не рэалізуюцца

На складах **Вубарскага леспрамгасу** (Лельчыцкі раён) валяцца вбруі на 11,000 руб., сядзёлак — на 5.000 руб. Апрача гэтага, на складзе можна яшчэ знайсьці шмат ботаў і інш. дэфіцытных тавараў.

І гэта ў той час, калі патрэбнасьць у гэтых таварах досыць вялікая. Леспрамгас ня прымае ніякіх мер, каб рэалізаваць тавары.

Май.

Пошта прыбывае са спазьненьнем... на 10 дзён

У Прылукі, дзе зьмянчаецца Дом Партасьветы ЦК КП(б)Б, вельмі дрэнна дастаўляецца пошта.

Замест накіраваньня пошты ў Прылукі праз разьезд **Воўчкавічы,** менская пошта накіроўвае яе ў **Семакавалавічы,** і таму яна прыбывае ў Прылукі... на 10 дзень пасьля высылкі.

А. Б.

Дабіліся зруху

СЛУЦК. (Наш кар.). Пленум ПАРЫЦКАГА сельсавету на пашыраным пасяджэньні разам з актывам рашуча асудзіў тэндэнцыі самацёку, якія назіраюцца з боку асобных работнікаў сельсавету ў мабілізацыі сродкаў і ў правядзеньні загатовак. Пленум абвясьціў сябе ударным па поўным выкананьні ўсіх планаў і вынікаў на сацпаборніцтва ПАРХІМАЎСКІ сельсавет. У выніку сацпаборніцтва Парыцкі сельсавет дабіўся значных посьпехаў у правядзеньні аднаразовага збору. Калі на 7-га лютага было сабрана толькі 19,4 проц., дык на 12-га лютага заданьне выканана на 42,8 проц.

Да адказнасьці вінаватых у дрэнным забесьпячэньні дрывамі

Забесьпячэньне прамысловасьці, устаноў і працоўнага насельніцтва Менску дрывамі ў пагражаючым становішчы (для МЦРК адгружаецца ўсяго 1-3 вагоны дроў у суткі).

Прэзыдыум гарсавету даручыў гарадзкому пракурору выявіць вінаватых у стварэньні гэтага становішча для прыцягненьня і х да адказнасьці.

Гарсавет зьвярнуўся з просьбай у СНК БССР абавязаць Лесбел адгрузіць в усіх пунктаў БССР дровы для Менску.

На дапамогу калгасам

Прэзыдыум гарсавету прапанаваў менскаму райвыканкому і райкалгасаўзу накіраваць сваіх спецыялістаў і адказных работнікаў на дапамогу калгасам у складаньні вытворчых плянаў.

Бюро газэтных выразак у Менску

У Менску адкрылася бюро газэтных выразак Наркамшляхтэлю, якое мае ўсе газэты БССР, уключаны нізавы і калгасны друк, на беларускай, расійскай і яўрэйскай мовах.

Мэта яго—за мажліва-мінімальную плату абслугоўваць газэтнай і часопіснай інфармацыяй установы і прадпрыемствы Савецкай Беларусі.

Ячэйкі „Таварыства прыхільнікаў радыё" на прадпрыемствах

Прэзыдыум ЦСПСБ прапанаваў усім прафарганізацыям, якія маюць радыёўстаноўкі, у месячны тэрмін арганізаваць ячэйкі «Т-ва прыхільнікаў радыё», набыць радыё-літаратуру і арганізаваць у некаторых клюбах спецыяльныя пакоі радыё-лябараторнай работы.

Вычышчаныя зноў на пошце

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.). Пасьля чыстки апарату пошты туды зноў пралезьлі клясава-варожыя людзі: **Іванчыкаў, Давыдаў і Пашкоў.** Гэта кампанія імкнецца скампрамэтаваць частку камсамольцаў, якія працуюць на пошце. Быў выпадак, калі Іванчыкаў сапсаваў тэлефонны апарат і прабаваў сваю віну зваліць на камсамольца.

РСІ павінна пераглядзець справу клясава-варожых элементаў, якія зноў прыліплі да Клімавіцкай пошты.

А. ВАРАНОВІЧ.

Плян вывазкі выкананага усяго на... 2 проц.

ЛАГОЙСК, 14. (Па тэлеграфу). Плян лесазагатовак і вывазкі ў **Лагойскім раёну пагражаючым становішчы.**

Уражаюе заданьне па вывазцы за ўдарны месяц 1931 г. выканана толькі на 2 проц.

Кожны дзень на вывазку павінна выяжджаць 3 тыс. фурманак; выяжджае каля 250-300.

Калгасы раёну ня ўдзельнічаюць у вывазках загатоўленых дроў і будаўнічых лесаматар'ялаў.

У нас — стаёй работы шмат, — гаворыць кіраўнікі калгасаў.

Райкалгасаюз нічога не зрабіў для таго, каб прымусіць калгасы выканаць даведзеныя да іх заданьні па вывазцы.

Няма рашучага націску па кулака, які сваёй антысавецкай прапагандай імкнецца сарваць лесазагатоўчыя пляны.

Райвыканком не правярае як сельсаветы выконваюць дырэктывы партыі. Сельсаветы на гэтым вучастку работы бязьдзейнічаюць. Не займаюцца пытаньнямі лесазагатовак і мясцовыя партыйныя ячэйкі.

Райком партыі і прафсаюзы не мабілізуюць мас калгаснікаў і бядняка-серадняцкага сялянства на змаганьне за выкананьне вызначаных плянаў, на ліквідацыю дапушчаных прарываў.

Усе гэтыя факты ярка сьведчаць аб права-апартуністычнай недаацэнцы лёса загатовак — гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Лагойская партыйная арганізацыя павінна рашуча рэагаваць на такое зьявішчэ і прыняць неабходныя меры, якія-б забясьпечылі пасьпяховае выкананьне лесазагатоўчых плянаў у тэрмін.

Л. Э.

Цэпэлін будучага



Вялікую зацікаўленасьць выклікаў за граніцай праект будучага цэпэліна, складзены нямецкім чарцёжнікам А. Кагльсвэртерам, **паводле пляну расійскага вучонага К. ЦВАЛКОЎСКАГА.** Яго перавагі заключаюцца ў тым, што ўвесь дырыжабль пабудован з мэталю, прычым сьцены—з хваля падобнай бляхі. Дырыжабль гэты павінен каштаваць у 50 раз таней, чым існуючыя дырыжаблі аднолькавай губагуры і грузападэмнасьці. Сьценкі шчэльны шарпірамі і, такім чынам, велічыня дырыжабля то павялічваецца, то памяншаецца ў адпаведнасьці з унутраным ціскам газу. Такім чынам, дырыжабль можа падымацца і зьніжацца бяз страты газу. З прычыны таго, што ўнутраны ціск газу перавышае зьнешні ціск, небясьпека выбуху зьніжаецца. Апрача таго гэты дырыжабль мае тую перавагу, што ня мае патрэбы ў эліпгу. Цікава адзначыць, што гэніяльныя праекты **К. Цвалкоўскага** пахаваныя ў архівах канцылярый царскага ўраду, зараз узмоцнена прапрацоўваюцца савецкімі вучонымі і прыцягваюць увагу зўрапейскіх вучоных колаў.

На здымку: Чарцёж дырыжабля будучага паводле праекту расійскага вучонага К. Цвалкоўскага.

Дэкада праверкі інкасацый мопраўскіх сродкаў праз пошту

ЦК МОПР'у БССР разам з **ЦКК-РСІ** праводзіць з **20 лютага па 1 сакавіка дэкаду праверкі інкасацый сродкаў праз пошту.** З гэтай мэтай ва ўсіх раёнах арганізуюцца «тройкі» з прадстаўнікоў РКК-РСІ, райпрафбюро і РК МОПР'у.

Вынікі праверкі будуць абгавораны на шырокіх сходах і асьветлены ў друку.

Тэлефанізацыя прыгараднага раёну

Гарсавет пастанавіў тэлефанізаваць саўгасы і калгасы новых сельсаветаў, далучаных да прыгараднага Менскага раёну.

Менская паштова - тэлеграфная канторы прапанавана палепшыць паштовую, тэлефонную і тэлеграфную сувязь з гэтымі сельсаветамі, а таксама палепшыць радыёфікацыю калгасаў.

Камсамол павінен быць актыўным удзельнікам мабілізацыі сродкаў

ЦК УсеЛКСМ зьвярнуўся да ўсіх рэспубліканскіх, нацыянальных і абласных камітэтаў камсамолу з тэлеграмай, у якой указвае, што на працягу студзеня, як і ў асобным квартале, камсамол не дапамагаў фінансавым арганізацыям выконваць свае заданьні на прыцягненьні сродкаў насельніцтва.

ЦК, ускладаючы адказнасьць за ход мабілізацыі сродкаў на камсамол, пагражае, што рэзультаты выкананьня фінпляну першага кварталу 1931 году будуць для мясцовых камсамольскіх арганізацый праверкай іх умення ўключацца ў баявыя вучасткі гаспадарчага фронту.

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— **БАН.** У 19 гадз.—агульны адкрыты сход яч. КП(б)Б БАН. Запрашаюцца беспартыйныя.

— **Дом Пісьменьніка.** У 19 гадз.—пасяджэньне т-ва літаратуразнаўцаў—марксыстаў. Тав. А. Кучар прачытае даклад пра аповесьць «Лявон Бушмар» К. Чорнага. Запрашаюцца рабочыя літгурткі, пісьменьнікі, настаўнікі, студэнты.

— **Клюб саўгандальслужачых.** У 20 гада. адбудуцца першыя заняткі струнпага музгурткА. Запіс у гурток працягваецца пры канц. клюбу.

ЗАЎТРА:

— **Культпроп Менгаркому КП(б)Б** паведамляе - слухачоў пачатковай гарнартыколы, што заняткі пазьменных груп адбудуцца 18 лютага з 10 гада. раніцы ў наступных памяшканьнях: па вул. К. Маркса ў Доме Камасьветы займаюцца групы: а) першая пазьменная—у кутку «Палітканцтаржанін», б) другая пазьменная—у пакоі № 25, в) сёмая пазьменная яўрэйская група—у пакоі № 18, г) група Менцвэю—у пакоі № 24, уваход у памяшканьне з вул. Энгельса. Трэцяя пазьменная група займаецца на Ленінскай вул. д. № 2, у пам. ленкутка Менгрыкатажу. Усім слухачом і прапагандыстам, якія працуюць у пазьменных групах, патрэбна зьявіцца без спазьненьня на паказаным адрасе.

— **Культпроп гаркому** паведамляе, што чарговыя заняткі вячэрніх курсаў гарнартакіпу адбудуцца 18-11-31 г. у 19 гадз., у залі пасяджэньняў гаркому КП(б)Б (3-ці паверх). Тэма заняткаў: лекцыя праф. Вальфсона «Матэрыялізм і ідэалізм і барацьба з рэлігіяй». Пуба ўсіх т. т., што займаюцца на курсах, абавязкова і без спазьненьня.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная канторa Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-12
Сакратар	10-74	Галоўная канторa	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-81

Умовы падпіскі (з дарэвым дадаткам „Прафух")

На 1 мес.	—	1 р.
„ 3 мес.	—	3 „
„ 6 мес.	—	6 „
„ 12 мес.	—	12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншы гарадзкія абвесткі—1 р. за радок, Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. Кантракцыйны вакуум выдавецтва № 52 100 047 у Дзяржбанку

Абвесткі прымаюцца ў канторах выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 63, 2-гі паверх. Тэл. 7-81.

Здавайце падпіску на газэту „Зьвязда" і на ўсе выданьні толькі на пошце

Сёньня, 17 лютага. Пакоі для Дрэваапрацоўшчыкаў. Пач. а 8 гадз.

Беларускі другі дзяржаўны тэатр В. Кіршон. **РЭЙКІ ГУДУЦЬ** Пьеса ў 5 дзеях. 12 абразох.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" З прычыны выключнага посьпеху **ішчэ тры дні** Гукавы фільм справа **13 дзён** «ПРАМПАРТЫІ» ХРОНІКА СЯЮЖНО № 1 за 1931 г. Каса—з 5 г.—Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура" Новы фільм вытворчасьці Сюжэтно (Трэстбелдзяржкіно) **Сапраўднае шыцьцё** Пач. сэансу: у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 гад. 20 мін. Каса 3—5 гадзін

КІНО „Інтэрнацыянал" Новы савецкі фільм вытв. „Працэно" **ЖАНЧЫНА Ў ЛЕСЕ** Пач. 1 сэансу ў 6 г.—Каса—з 4 г. 30 м.

КІНО „Пралетары" **Апошнія 3 дні** 16, 17 і 18 лютага мастацкі фільм паводле раману ШОЛОМ-АЛЕЙХЕМА **МАБУЛ** (Крывавы паток) драма ў 9 частках. Пач. 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 4 гадз.

Кіно „Юны Піянэр" **Даюць фільмы ў сэянс** 1) **ПРЫГОДЫ АРЫШКІ** ў 5 частк. 2) **Сенька Афрыканец** ў 2 частк. Пач. сэансу з 1 гадз. Каса—з 12 г.

КІНО „СПАРТАК" **2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі** **ЗАКРОЙШЧЫК З ТАРЖКА** намедзія ў 6 частках. Пач. 7 г., 8 г., 45 м., 10 г. 30 м. Каса—з 5 г.

ВЯЧЭРНІ КАМВУЗ ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА, ШТО **ўкамплектаваньне** ў вячэрні камвуз **студэнцкага набору** **працягнута да 1-га сакавіка 1931 г.** Просьба да ўсіх сакратароў ячэек і сэктараў партвучобы не затрымліваць анкеты і перасылаць у вячэрні камвуз. **Вячэрні Камвуз.**

ДЛЯ ЧАГО ПАТРЭБНА ШЧАЦІНА І КОНВОЛАС.

З шчаціны і конволасу робяцца на фабрыках тэхнічныя шчоткі, нісьці, валасяная тканіна, кручаны волас для прамысловасьці будаўніцтва, судабудаўніцтва і ваенных патрэб.

Робяцца таксама з шчаціны і конволасу шчоткі для чысткі коняй і скаціны, шавецкія, здзекныя, падлогавыя, для мыцьця бялізны, зубныя і інш. шчоткі, якімі шырока абслугоўваюцца патрэбы працоўных мас.

Шчаціна і конволас апрацоўваецца на экспарт, які зьяўляецца хлямам і выгодным для нашай дзяржавы на ўсіх замежных рынках. На вырачэньня грошы ад рэалізацыі шчаціны і конволасу набываюцца загранічнай патрэбнай для сацыялістычнага будаўніцтва машыны, трактары і інш.

Кошт гадавой прадукцыі (тавары са шчаціны і конволасу) складае 9 мільёнаў рублёў у год, з якіх значную суму складае экспартная прадукцыя. Акрамя таго фабрыкі, якія апрацоўваюць шчаціну і конволас, даюць штогод сацыялістычнаму накапленьню да 1 мільёна рублёў прыбытку.

Шчаціна і конволас загатоўляюцца ўсёкі раённымі і сельскімі загатоўчымі пунктамі, а таксама іх зборшчыкамі па наступнай цане:

1. Шчаціна хрыбтовая доўгая да 4¾ дюймаў 10 руб. 50 кап. кілёграм,
» » кароткая да 4¾ » 4 руб. 25 кап. »
» бакавая мяккая да 4¾ » 4 руб. 20 кап. »
» » » ніжэй 4¾ » 2 руб. 50 кап. »
2. Конволас касіца—2 р. 40 к. кілёгр., абрубак—2 р. 70 к. кілёгр., грыва—1 р. 10 к. кілёгр.
3. Кароўі хвасты—караўняк—95 кап. кілёграм.

Пры прыёмцы шчаціны і конволасу здатчык прэміюецца ва 25 проц. таварамі і 75 проц. грашыма.

Як здымаць шчаціну са сьвіных скур.

У тых выпадках, калі пры забоі сьвіні зьнімаецца скура, дык здымаць шчаціну трэба наступным чынам:

Скура прывешваецца да сьценкі з такім разьлікам, каб яна была надцягнута, пасьля чаго такім-жа чынам, як і на сьвіні, коучкоп, зроблены з сьвіка, шмугмываецца шчаціна на ніжэй вытура дзюйма. Шчаціна ніжэй гэтага зьнімецца на гарбарных тэхнічным спосабам. Пакольні прадукцыя (тавар), якая робіцца з шчаціны і конволасу займае значнае месца ў нашай сацыялістычнай гаспадарцы, дык кожны здатчык (калгас, саўгас і інш.) павінен быць зацікаўлен у поўнай здымцы, зборцы і здачы шчаціны і конволасу.

БЕЛПУШШЧАЦІНА

БЕЛСАДАГАРОДНІНА ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА Белкаапсаюзу, Белсельтрэсту, Белдзяржсьпірту, Белхарчаб'яднаньню, Белсампрамсаюзу, Белкалгасцэнтру, Белмясо, Белмалжывсаюзу, трэсту «Сьвінавод», ВСНГ і РВК

ШТО ЗАЯЎКІ НА БУЛЬБУ, САДОВІНУ І ГАРОДНІНУ з ураджаю 1931 г. для патрэб прамысловасьці, а таксама адкормачных аперацый

ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗДАНЫ ў дакладным выглядзе

НЕ ПАЗЬНЕЙ 28 ЛЮТАГА г. г.

Непрадастаўленьне да паказанага тэрміну заявак ускладае на запаведныя арганізацыі адказнасьць за наўключэньне іх у плян забесьпячэньня.

БЕЛСАДАГАРОДНІНА.

ПРЫБЛУДЗІЎСЯ кабель ориай масьці, лягавы. Праз 3 дні лічу сваім. Тэлефон № 6-57.

ЗНОЙДЗЕНЫ аблігацыі 3-ай пазыкі індустрыялізацыі. Зьвярнуцца ў сэктар абвестак выдавецтва «Зьвязды»—Савецкая, 63, 2-гі паверх.

ВІЦЕБСКІ індустрыяльна-пэдагагічны інстытут АБВЯШЧАЕ **ВЕСНАВЫ ПРЫЕМ** студэнтаў на аддзяленьні:

1) **Хэміка-тэхналёгічнае;**